ЗДАРОЎЕ. ПРАКТЫЧНЫ ПАДЫХОД

МС

ЛАБАРАТОРЫЯ У КАНТЭЙНЕРЫ

МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 ЛІПЕНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 137 (29251)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр КАЗАКЕВІЧ, намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:

«За апошнія 15-20 гадоў мы істотна павялічылі ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур: збожжавых і зернебабовых — з 28 да 35 ц/га, бульбы — з 150 да 250 ц/га, буракоў — з 220 да 460 ц/га, ільновалакна — з 6 практычна да 10 ц/га. Гэтыя вынікі дасягнуты шмат у чым за кошт работы аграрнай навукі. Навуковае забеспячэнне неабходнае для развіцця сельскагаспадарчай галіны».

КАРАТКА

• **У Гродне пашыраць выкарыстанне электратранспарту.**

• Пасольства ва Узбекістане сумесна з «Белавія» арганізавала чартарныя рэйсы для вяртання беларусаў дадому.

• **Беларускія валейбалісткі возьмуць удзел у маладзёжным ЧЕ-2020.**

• Беларускія навукоўцы распрацоўваюць новыя сарты персікаў.

• **Экспарт беларускіх тавараў ва Узбекістан за студзень—май павялічыўся да $68,7 млн.**

• З 12 жніўня мінчане могуць абмяняць чэкі «Маёмасць» на акцыі сталічных прадпрыемстваў.

• **Ураджайнасць збожжавых, бульбы, буракоў і лёну ў Беларусі значна выраслa за апошнія 15-20 гадоў.**

• Чэмпіянат свету па фехтаванні 2021 года ў Егіпце адменены.

• **Абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць у 14 раёнах Беларусі.**

ISSN 1990 - 763X

Вялікая вада Аляксандра Рыжова

Жыхар Жодзіна Аляксандр РЫЖОЎ у летнія дні прыходзіць на тэрыторыю спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву па веславанні на байдарках і каноэ, каб патрэніравацца — нетаропка спускаецца да вады, садзіцца ў сваю асабістую байдарку, выслуе да сярэдзіны ракі. Менавіта ў гэтай школе ў свае падлеткавыя і юнацкія гады Аляксандр далучаўся да спорту, а цяпер на базе ўстановы дзейнічае ветэранскі клуб-каманда, які ствараўся пры яго ўдзеле. Сам Аляксандр уваходзіць у групу нашых параалімпійцаў па веславых відах спорту і ўвесь вольны час рыхтуецца да вялікіх і малых спаборніцтваў.

Пасля школы ён паступіў у ваеннае вучылішча, потым стаў афіцэрам. На вучэннях быў цяжка паранены, застаўся без нагі. Але спорт даў мужчыну веру ў сябе, запаліў агеньчык надзеі, у тым ліку і алімпійскай, зрабіў аптымістычным і жыццярадасным чалавекам. Цяпер Аляксандр — вядомая ў горадзе асоба: стварыў і ўзначальвае будаўнічую фірму, дапамагае сацыяльным праектам, на свае зберажэнні ўзвёў прыгожую капліцу-званіцу на месцы разбуранай у шасцідзясятыя гады царквы. Упартасцю ды поспехамі ў спорце, жыццёвай стойкасцю Аляксандр стаў прыкладам для многіх жодзінскіх падлеткаў.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Надвор'е і клімат

АМАЛЬ САМАЕ ЦЁПЛАЕ ПАЎГОДДЗЕ,

пачынаючы з 1945 года

Як адзначыла намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана КУЗЬМІЧ, адной з актуальных праблем сусветнай эканомікі і міжнароднай палітыкі ў XXI стагоддзі з'яўляецца праблема змены клімату.

— Клімат мяняўся заўсёды, але пад уздзеяннем натуральных прычын. Асаблівасцю змены клімату ў цяперашні час з'яўляецца яго антрапагенны характар, — паведаміла яна.

У Беларусі змены клімату назіраюцца з 1989 года — з анамальна цёплага студзеня, і за гэтыя 30 гадоў тэмпература паветра павысілася на 1,3 градуса (прыблізна 0,4 градуса за 10 гадоў). Мінулы, 2019-ы быў самы цёплы за ўсю гісторыю нацыянальных метэаназіранняў, і пачатак 2020-га ад яго не адрозніваўся — сярэднямесячная тэмпература студзеня і лютага была вышэйшая за кліматычную норму на пяць з лішнім градусаў. Сакавік і чэрвень таксама былі цёплыя, а вось красавік і май — халаднейшыя за кліматычную норму.

Суперхалодная канцоўка вясны і позняе лета

Але гэта выключэнне з правіл. Досыць халодны май, здавалася б, перакрэсліў прадказанні спецыялістаў аб чарговай хвалі цяпла — але не. Увогуле першае паўгоддзе бягучага года было вельмі цёплае.

СТАР. 4

Шануй сваё

ПЕХАТОЙ У КАЗКУ, МОЖНА І НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

Альтэрнатывай замежным падарожжам можа стаць экалагічны адпачынак

Колькі раз даводзілася бываць у Белавежскай пушчы, падлічыць вельмі складана. Часцей сюды прыводзілі журналісцкія справы: пушчу наведваюць высокія ўрадавыя дэлегацыі і вясёлыя кампаніі міжнародных маладзёжных альбо спартыўных суполак. Прыязджалі ў нацпарк таксама сям'ёй з дзецьмі — але заўсёды гэта было ў складзе нейкіх арганізаваных груп. А вось каб невялікай камернай кампаніяй, такога і не згадаю.

СТАР. 3

puszcza.urest.org

МАГЧЫМЫЯ ВАРЫЯНТЫ

Беларуская армія можа спалучаць у сабе элементы кантрактнай і тэрміновай службы

Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас наведвання 103-й Віцебскай асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады.

Фота БелТА.

Нядаўна кіраўнік дзяржавы наведаў 38-ю Брэсцкую асобную гвардзейскую дэсантна-штурмавую брыгаду. Як растлумачыў камандуючы сіламі спецыяльных аперацый Вадзім Дзенісенка, у 103-й брыгадзе ў Віцебску ёсць міратворчае падраздзяленне. Тут служаць выключна кантрактнікі. Яны могуць выконваць задачы ў рамках місій ААН, АДКБ і праграмы НАТА «Партнёрства дзеля міру». У астатнім брыгады ідэнтычныя.

«Яшчэ адзін прыклад, якая павінна быць армія: кантрактная, тэрміновая служба і іншае. Там, дзе трэба, — яна ўся на кантракце. Там, дзе могуць служыць хлопцы-тэрміновікі, мы развіваем тэрміновую службу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўніку дзяржавы расказалі пра гісторыю фарміравання, прызначэнне і баявыя магчымасці міратворчай роты, прадэманстравалі розныя варыянты яе экіпіроўкі, узбраенне і ваенную тэхніку.

Прэзідэнт пацікавіўся, ці ёсць у брыгадзе праблемы з наборам вайскоўцаў на кантракт. Як запэўніў Вадзім Дзенісенка, ахвотных трапіць на кантракт у сілы спецыяльных аперацый шмат, таму тут складваецца вялікі конкурс.

Асаблівы акцэнт падчас візіту быў зроблены на дэманстрацыі Прэзідэнту экіпіроўкі, узбраення, якія выкарыстоўваюць міратворцы. Расказалі кіраўніку краіны пра асаблівасці нясення службы ў міратворчых сілах. На пляцы вайскоўцы прадэманстравалі тактычны эпізод дзеяння міратворчых сіл на пункце пропуску і майстэрства кіравання бронетранспарцёрамі падчас «вальса» БТР.

Прэзідэнт таксама сустрэўся з афіцэрамі 103-й брыгады, 33-га атрада спецыяльнага прызначэння, камандзірамі воінскіх часцей Віцебскага гарнізона і супрацоўнікамі АМАП.

Аляксандр Лукашэнка пачаў гутарку з рэтраспектыўнага агляду, нагадаў пра мадэрнізацыю беларускіх Узброеных Сіл, закрануў сённяшнія глабальныя геапалітычныя пытанні.

Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.

Учора позна ўвечары Прэзідэнт узяў удзел у цырымоніі адкрыцця фестывалю «Славянскі базар». Падрабязнасці — ужо зараз на сайце zviazda.by і ў заўтрашнім нумары «Звязды».

Выбары-2020

ЛІЧБЫ ПРАЗ ПРЫЗМУ ПАЛІТЫКІ

Эксперты абмеркавалі вынікі сацыялагічнага даследавання электаральнага рэйтынга

Другі нацыянальны тэлеканал (АНТ) у сераду ўвечары ў праграме «ОбъективНо» прадставіў апублікаваныя напярэдадні на сваім сайце і ў сацыяльных сетках даныя сацыялагічнага даследавання рэйтынга ўдзельнікаў электаральнай кампаніі, якое па заказе тэлеканала правёў аналітычны цэнтр ECOOM.

«Паводле атрыманых у ходзе апытання звестак, 87,3 % насельніцтва краіны плануе ўзяць удзел у маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах, — сказана ў даследаванні. — Што датычыцца электаральных пераваг грамадзян у дачыненні да прэтэндэнтаў у кандыдаты, вынікі размеркаваліся наступным чынам. Дзеючага кіраўніка дзяржавы гатовыя падтрымаць 69,4 % грамадзян Беларусі. Рэйтынгі астатніх прэтэндэнтаў у кандыдаты не перавышаюць сумарна 14,6 %.

Не хочуць альбо не могуць паказаць свае электаральныя перавагі сумарна 12,5 % рэспандэнтаў. Супраць усіх кандыдатаў маюць намер галасаваць 3,5 % апытаных.

Між тым па меры набліжэння даты выбараў прагназуецца далейшы рост электаральнага рэйтынга А. Лукашэнкі (больш за 70 %), у тым ліку за кошт тых, хто не вызначыўся (12,5 % рэспандэнтаў).

Пры гэтым узровень даверу дзеючаму Прэзідэнту, які ўключае не толькі электаральны рэйтынг, але і ацэнку сацыяльна-эканамічнай палітыкі кіраўніка дзяржавы, эфектыўнасці рашэнняў, якія ім прымаюцца, паводле апытання, складае 78,1 %».

Даследаванне праводзілася яшчэ да рэгістрацыі прэтэндэнтаў кандыдатамі ў прэзідэнты Беларусі, таму ў іх фігуруюць Віктар Бабарыка і Валерый Цапкала, якім Цэнтрвыбаркам 14 ліпеня адмовіў у рэгістрацыі. Сукупная колькасць апытаных, якія адказалі б перавагу гэтым прэтэндэнтам, не перавысіла 10 працэнтаў.

«Па Ціханоўскай, па Канапацкай узнікла цікавая сітуацыя, — расказаў у праграме **дырэктар аналітычнага цэнтра ECOOM Сяргей МУСІЕНКА**. — Мы адсякалі адказы «за жанчыну» — прозвішча не маглі назваць. А мы не можам падказваць. «Ну за жанчыну» — «За якую?» Блыталіся».

Яшчэ адзін часты адказ быў — «жонка блогера», ён таксама не ўлічваўся, як і адказ «блогер». Нярэдка не маглі згадаць і прозвішча старшыні партыі «Грамада» Сяргея Чэрачня. На думку Сяргея Мусіенкі, кандыдат і сам разумее, што яго прозвішча цяжка запомніць, таму імкнецца абыграць яго ў слогане выбарчай кампаніі» «Чэ!рачэнь».

Кіраўнік ECOOM лічыць, што ў ліку тых, што адмаўляўся адказваць альбо не мог вызначыцца, хаваецца і рэйтынг Алега Гайдукевіча, які выйшаў з кампаніі на этапе збору подпісаў і днямі стаў даверанай асобай Аляксандра Лукашэнкі.

Выбарку склалі больш за 1800 рэспандэнтаў, чаго, на думку Сяргея Мусіенкі, дастаткова, каб зразумець настрой усёй Беларусі: апытваліся прадстаўнікі розных населеных пунктаў і сацыяльных груп.

Яшчэ адзін рэйтынг, складзены ECOOM, датычыцца даверу дзеючаму кіраўніку дзяржавы. Дарэчы, рэйтынг даверу аказаўся вышэйшы за электаральны.

«Гэта тая катэгорыя людзей, якія, умоўна кажучы, яшчэ, можа, не вызначыліся альбо абралі кандыдата, які зняўся, але ў цэлым яны ацэньваюць палітыку дзяржавы і яе кіраўніка як правільную», — мяркуе дырэктар Аналітычнага цэнтра.

Удзельнік праграмы **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Андрэй САВІНЫХ** расказаў: «Ёсць яшчэ адзін цікавы факт, з якім я сутыкнуўся падчас сваёй выбарчай кампаніі, калі быў кандыдатам у дэпутаты. Уяўляеце, апазіцыйна настроены чалавек, калі ён даходзіць да выбарчай кабінкі, не факт, што прагаласуе «супраць». Ён у рэшце рэшт, у апошні момант робіць выбар на карысць кансалідацыі і стабільнасці грамадства. У мяне рэальна былі некалькі прыкладаў, калі апазіцыйна настроеныя людзі прызнаваліся, што галасавалі за мяне».

Андрэй Савіных адзначыў, што ў грамадстве павысіўся градус імкнення да перамен, з'явілася жаданне больш дынамічнага сацыяльнага развіцця, і Прэзідэнт пасылае адпаведны сігнал цалкам дакладна: «Ён кажа: нам патрэбны змены ў Канстытуцыі, нам патрэбна трансфармацыя ўладных інстытутаў, і нам патрэбна больш дынамічнае грамадства».

Дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя» Аляксандр ШПАКОЎСКІ пагадзіўся: дзеючы кіраўнік дзяржавы робіць акцэнт на тым, што перамены ў Беларусі будуць, але праз Канстытуцыю, а не праз «майдан». «І гэта вельмі ўдала накладаецца на менталітэт беларускага народа, бо беларусы не хочуць ніякага гвалту», — сказаў эксперт.

Удзельнікі тэлепраграмы выказалі меркаванне пра тое, што ў краіне, хутчэй за ўсё, працягнуцца правакацыі, будуць і спробы аспрэчыць вынікі галасавання «вулічным шляхам», калі яны не задаволяць пэўныя сілы, але ў цэлым сітуацыя застанецца кіраванай з боку дзяржавы.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Блізкая ўлада

РАМОНТ ЖЫЛЛЯ, ДАРОГІ І ЗЯМЕЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Шулейка правёў прамую тэлефонную лінію для жыхароў рэгіёна. Звароты грамадзян прымалі ў аблвыканкаме. За дзве гадзіны на прамую лінію да памочніка Прэзідэнта паступіла больш за два дзясяткі званкоў з розных куткоў вобласці.

Гамяльчанін Віктар Васілевіч паскардзіўся, што яшчэ ў маі атрымаў ключы ад кватэры ў новабудоўлі на вуліцы Пенязькова, але святла ў доме няма да гэтага часу. Самотны пенсіянер Дзмітрый Міхайлавіч прасіў растлумачыць, як па ўсіх правілах атрымаць сацыяльнае жыллё. Мужчына прызнаўся, што жыве ў інтэрнацкім пакоі, яму прапануюць выпісацца і перавесці атрыманае арэнднае жыллё ў статус сацыяльнага.

— Баюся застацца каля разбітага карыта і згубіць усё, — папрасіў парады пенсіянер і атрымаў аператыўную інфармацыйную падтрымку.

Яшчэ адна жыхарка Гомеля Таццяна Віктараўна звярнулася з просьбай разабрацца ў законнасці прыбудовы ў доме па вуліцы Жаркоўскага. Жанчына жывe па першым паверсе, але, з яе слоў, сонца ў вокны не заглядвае ўжо чатыры гады. Зацяняе кватэру лоджыя, якую прыбудавалі суседзі зверху. У адміністрацыі раёна жанчыне растлумачылі, што ёсць праект і дазвол на будаўніцтва, а згода іншых жыхароў не патрабуецца. Між тым дадзена даручэнне разабрацца ў аб'ектыўнасці звароту гамяльчанкі.

На адрас аднаго з абанентаў прамой тэлефоннай лініі Юрый Шулейка паабяцаў выехаць асабіста. Жыхарка вуліцы Гогаля ў Гомелі паскардзілася на падтапленне яе зямельнага ўчастка падчас дажджу. Прычына — у розніцы вышынь з суседнімі домаўладаннямі.

Прыпынак грамадскага транспарту ў аграгарадку Краснае Гомельскага раёна будзе ўсталяваны да канца жніўня. Вычарпальны адказ на свой зварот атрымала жыхарка населенага пункта Любоў Супічэнка, якая ўжо раней задавала гэтае пытанне.

Паўторна звярнулася на прамую лінію і шматдзетная маці з Раманавіч. Раней яна прасіла пасыпаць друзам дарогу, бо аўтамабілі падымаюць пыл. Як растлумачыла жанчына, просьбу выканалі часткова: пасыпалі толькі невялікі ўчастак побач з яе домам. Шматдзетная мама таксама прасіла ўладкаваць штучную няроўнасць каля стадыёна. Пытанні ўзятыя на кантроль, дадзены распараджэнні канкрэтным адказным асобам.

У тэрміновым парадку неабходна разабрацца і ў сітуацыі інваліда-калясачніка — жыхара пасёлка Піянер, які некалькі гадоў дамагаецца атрымання кватэры на першым паверсе.

У размове з журналістамі пасля заканчэння прыёму Юрый Шулейка адзначыў:

— Усе ўзнятыя тэмы аб'ектыўныя. Адны з іх патрабуюць тлумачэння, іншыя — разгляду з выездам на месца і прысутнасці ўсіх бакоў. На жаль, яшчэ ёсць пытанні, якія не вырашаюцца на працягу доўгага часу, хоць людзі звярталіся да мясцовых улад. Адказы на звароты не могуць быць палавіністымі, па кожным неабходна прымаць вычарпальныя рашэнні.

Памочнік Прэзідэнта адзначыў, што ў агучаных праблемных пытаннях ёсць момант зацягвання справы:

— Звярнулася сям'я з Ельска, у якой згарэў дом пасля работ па газіфікацыі. Гэта недапрацоўка органаў, якія павінны даць заключэнне аб вінаватых і кампенсацыі шкоды, каб маладая сям'я магла працягнуць рамонт жылля. На жаль, ёсць шэраг пытанняў, якія не вырашаны мясцовымі ўладамі. Дадзена даручэнне разабрацца і прыняць канчатковае рашэнне.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Выслухаюць і дапамогуць

Традыцыйна, па суботах, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператорчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі у суботу, 18 ліпеня, з 9:00 да 12:00 правядуць:

✓ намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ.Тэл. 8 016 221 31 21;

✓ кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

✓ намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

✓ старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

✓ намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

✓ намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

✓ старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Лаўрыненку Ігару Уладзіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

ПАДЗЕЯ, ЯКАЯ ЯДНАЕ

Філіп КІРКОРАЎ ля сваёй імянной зоркі, адкрытай учора ў Віцебску.

У Віцебску ўчора распачаўся 29-ы па ліку найбуйнейшы фестываль на постсавецкай прасторы.

Абласны цэнтр па традыцыі жыве ў асаблівым «базарным» рытме. Сёлета пандэмія ўнесла карэктывы ў планы арганізатараў — напрыклад, афіцыйная праграма стала карацейшыя: усяго чатыры дні. Але і ў новым фармаце фэст, можна не сумнявацца, будзе цікавы.

У сувязі з пандэміяй незвычайнай стала акрэдытацыя для ўдзельнікаў «базару»: у дырэкцыі пры ўваходзе хлопцы ў цывільным вымяраюць тэмпературу і просяць апрацаваць антысептыкам рукі. Тэмпературны кантроль і пры ўваходзе на канцэртныя пляцоўкі. А вось маскі — не абавязковая ўмова, і можна пры жаданні іх як насіць, так і не.

Учора адбылася першая прэс-канферэнцыя, дзе традыцыйна агучылі некаторыя лічбы і факты, якія датычацца фестывалю. Напрыклад, у 2020 годзе на ім працуе больш за 300 журналістаў, усяго ў Віцебску прадстаўленыя 23 краіны, а ў міжнародным дзіцячым і дарослым конкурсах выступяць — ужо дакладна — прадстаўнікі 17 і 14 краін адпаведна. Героем першай «Зорнай сустрэчы» стаў артыст балета Сяргей Палунін — самы малады ў гісторыі прэм'ер Каралеўскага балета ў Лондане і спецыяльны госць сёлетняга віцебскага форуму.

Міністр культуры Беларусі Юрый Бондар канстатаваў: фестывальны дэвіз «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення», сёння, бадай, як ніколі актуальны, бо форум спрыяе яднанню і ўзбагачэнню духоўнай спадчыны славянскіх народаў.

Вадзім Заранкін, старшыня Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта, пажартаваў, што зоркі не толькі зноў сышліся, каб фестываль-старажыл працягваў сваё існаванне, але і з'ехаліся. Месца сустрэчы змяніць нельга! І нават дажджы не сапсуюць настрой.

А ўвечары адбыўся і першы канцэрт — урачыстае адкрыццё XXIX Міжнароднага фестывалю мастацтваў, рэжысёр якога Аляксандр Вавілаў з дапамогай артыстаў і творчых калектываў з розных краін трансліраваў на віцебскай сцэне простую і вельмі актуальную і важную сёння думку «Я люблю цябе, жыццё!..» Падрабязней пра цырымонію адкрыцця «Звязда» раскажа ў суботнім нумары. А пакуль нагадаем, што сёння, 17 ліпеня, на фестывалі пройдуць разнастайныя мерапрыемствы Дня Саюзнай дзяржавы, увечары ў Летнім амфітэатры на канцэрце «Саюзная дзяржава запрашае...» можна будзе паслухаць «Жывую музыку кіно» ад аркестра «Фанограф сімфа-джаз» пад кіраўніцтвам Сяргея Жыліна і папулярных выканаўцаў Беларусі і Расіі, а на пляцоўцы каля КЗ «Віцебск» — паглядзець фінал II Міжнароднага фестывалю Dream Dance Fest.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота БелТА.

Наш фармат

На «Славянскім базары ў Віцебску» збіраюць «Букет дабрыні»

Дабрачынную акцыю ладзіць дырэкцыя міжнароднага фестывалю мастацтваў сумесна з віцебскім абласным аддзяленнем Беларускага фонду міру. Віртуальны «букет» стане альтэрнатывай традыцыйным кветкам, якіх сёлета публіка не зможа падарыць любімым артыстам — доступ на сцэну Летняга амфітэатра абмежаваны ў сувязі з эпідэміялагічнай абстаноўкай.

«Выказаць свае пачуцці і падзякаваць выканаўцам за іх творчасць можна будзе, беручы ўдзел у акцыі «Букет дабрыні», — кажуць у Цэнтры культуры «Віцебск». — Для гэтага трэба пералічыць на спецыяльна створаны рахунак любую суму грошай, якія вы меркавалі выдаткаваць на прэзенты ці кветкі артыстам». Зрабіць гэта можна як у банкаўскіх аддзяленнях, так і самастойна праз сістэму АРІП — рэквізіты змешчаныя ў дырэкцыі фестывалю і на сайтах www.gck.by і fest-sbv.by. Усе сродкі, якія паступяць на дабрачынны рахунак, будуць скіраваныя на дапамогу выхаванцам Сенненскай школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

Акцыя «Букет дабрыні», дарэчы, праходзіць у Беларусі і іншых краінах таксама ў Дзень ведаў, калі замест кветак настаўнікам бацькі і школьнікі ахвяруюць грошы на лячэнне цяжкахворых дзяцей.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПЕХАТОЙ У КАЗКУ. МОЖНА І НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І наўрад ці было б гэта ажыццёўлена ў бліжэйшы час, каб не мая сяброўка юнацтва, якая даўно жыве ў Маскве. Як той казаў, няма ліха без дабра. Вось і яны гэтым летам не планавалі падарожжа на малую радзіму, ды пандэмія памяняла ўсе планы: прыехалі. А паколькі прымаць гасцей дома цяпер не асабліва і выпадае, мы дамовіліся сустрэцца ў пушчы. Яна выбралася ў родныя мясціны з дачкой і патэнцыйным зяцем. Маладыя людзі ніколі не былі ў пушчы раней, таму выказалі жаданне ўбачыць гэтую славутасць. Дарэчы, машын з расійскімі нумарамі на стаянцы каля Нацыянальнага парка зусім не мала. Цяперашнія турысты дабіраюцца ў асноўным сваім транспартам, хоць гэта нескладана зрабіць і грамадскім: з аўтавакзала ў Брэсце рэгулярна ходзяць аўтобусы, маршруткі. Ад меж горада да памянёнай стаянкі каля 60 кіламетраў.

На стэндзе перад уваходам мы прачыталі ўсю інфармацыю пра паслугі і экскурсіі. Зрабіць гэта можна і загадзя, скарыстаўшыся ўласным смартфонам. Цяперашняга турыста, зацікаўленага ўбачыць векавы лес на свае вочы, прытым не спяшаючыся, думаю, прыцягне магчымасць веласіпеднай экскурсіі. Адкрыць для сябе пушчу цяпер можна па шасці веламаршрутах працягласцю ад 1,5 да 4 гадзін. Самае малое падарожжа даўжынёй 10 кіламетраў называецца «Царская паляна», далей па працягласці ідзе «Войтаў мост» — 15 кіламетраў, «Звярыны пераход» усяго на кіламетр большы за папярэдні, «Вялікае падарожжа» расцягнецца на 27 кіламетраў, а адрэзак «Каменюкі — Белы лясок» займае 28 кіламетраў.

Пракат веласіпедаў арганізаваны без выхадных і перапынкаў. Узяць двухколую машыну на чатыры гадзіны каштуе 15 рублёў. Калі ж наездзіце больш, кожная наступная гадзіна «зацягне» на 2 рублі. Дарэчы, у кошт пракату ўваходзіць наведванне вальеры з жывёламі. Звяроў трэба паглядзець, асабліва тым, хто трапляе ў пушчу ўпершыню. Цікавая акалічнасць: у вальеры цяпер жыве зубр, які праславіўся ў 2016 годзе тым, што прыбіўся да статка кароў у Кобрынскім раёне і пражыў на ўсім гатовым нібы сыр у масле каля двух месяцаў. Пра багатую біяграфію пушчанскага насельніка «Звязда» расказвала ў нумары за 14 верасня 2016 года. Цікава было паглядзець на рагатага Казанову зноў.

Нашы маладыя людзі выбралі велападарожжа «Царская паляна» — відаць, назва прывабіла. І не пашкадавалі. Потым з захапленнем расказвалі пра бярозу з «галавой зубра». Нарост на дрэве, што нечым сапраўды нагадвае галаву гаспадара пушчы, заўважылі больш за 20 гадоў таму. Падобны нарост утвараецца, паводле слоў спецыялістаў, калі ў ствол укараняецца іншародны арганізм. Часцей за ўсё гэтымі няпрошанымі гасцямі з'яўляюцца грыбы розных відаў. Дрэва перахварэла і прызвычаілася, а іншародны арганізм утварыў экзатычны горб. Таксама на шляху гэтай экскурсіі сустракаецца аграмадны раскошны дуб-пустэльнік. Дрэву трыста гадоў — для дуба не такі вялікі ўзрост, але дыяметр ствала ўжо перавысіў паўтара метра. Мне гэты дуб заўсёды нагадвае разважанні Андрэя Балконскага ў «Вайне і міры» пра перамогу жыцця.

Балота «Татарская багна» ўжо высахла, а назва засталася, бо ў XIII стагоддзі тут стаялі татары, якія дабраліся падчас нашэсця аж сюды. Былая вузкакалейная дарога, уведзеная немцамі падчас Першай сусветнай, — цяпер вельмі маляўнічае месца. Акупанты тады пабудавалі дарогу, каб вывозіць лес з пушчы. Усяго за паўтара года рукамі палонных паклалі сетку чыгункі працягласцю 325 кіламетраў. Цяпер на месцы асобных вузкакалеек пракладзены асфальт, па ім якраз і праходзяць веламаршруты. Ну і сама паляна цяпер — экзотыка і славутасць. Размешчана яна пасярод гушчару. Паводле некаторых звестак, упершыню тут зладзіў паляўнічы баль кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. З яго лёгкай рукі на паляне сталі гуляць цары, потым генеральныя сакратары. Ну і сучаснікі не адстаюць: сёння тут праводзяцца святы, масавыя мерапрыемствы. А яшчэ па маршруце варта спыніцца ва ўрочышчы «Турлюй», паглядзець маляўнічую лясную развілку, стагадовы сасновы лес ды шмат чаго іншага. І галоўнае — атрымліваць асалоду можна няспешна, робячы прыпынкі калі пажадаеш і дзе пажадаеш.

А яшчэ мы адкрылі для сябе гэтым разам пешыя маршруты, якімі можна выправіцца і пазнаваць для сябе пушчу наноў. На экалагічнай сцяжыне «Азёрны пярсцёнак» ёсць тры штучныя возеры. Яны створаны ў пачатку 1970-х гадоў для рэгулявання гідралагічнага рэжыму. Вада ў іх цёмная, бо на дне ёсць залежы торфу. І ў гэтай цёмнай вадзе па-асабліваму адлюстроўваюцца дрэвы, сонца, неба — нібы не натуральнае відовішча, а сфакусіраванае на нейкім экране, да таго ж цішыня і запаволенасць наогул ствараюць эфект анімацыі, казкі... Але ў сапраўдную казку трапляеш не тут, а ў запаведнай дубраве, дзе пад полагам дуба і граба стаіць вечны цень. Расліны, што прывычаіліся да гэтага паўзмроку, уяўляюць сабой асабліваe зялёнае покрыва з цемнаватым адценнем, што стварае ўражанне, нібы трапляеш у глыбокую старажытнасць: здаецца, вось так было, можа, тысячу гадоў таму. А можа, і сапраўды было так? І цішыня, заспакоенасць, якія бываюць толькі ў пушчы: ніякі іншы лес гэтага не мае. Прынамсі, Караткевіч дакладна апісаў пушчу у сваёй «Зямлі пад белымі крыламі».

...У пушчы цяпер можна паглядзець музеі, у тым ліку і новы археалагічны пад адкрытым небам. Можна наведаць заказнік «Выганашчанскі» ў Івацэвіцкім раёне, які цяпер таксама ўваходзіць у Нацыянальны парк. Аматарам новых ураженняў карысна будзе адкрыць для сябе і Ружанскую пушчу — не такі раскручаны рэкламай і асвоены турыстамі, але надзвычай цікавы і загадкавы лясны масіў. У любым выпадку варта хоць зрэдку выбірацца ў запаведныя мясціны, шчодра раскіданыя па нашай зямлі. Прырода ўмее даваць сілы, да таго ж яна ніколі не здраджвае і не падманвае.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АМАЛЬ САМАЕ ЦЁПЛАЕ ПАЎГОДДЗЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сярэдняя тэмпература паветра за шэсць месяцаў склала плюс 7,3 градуса, што на 2,6 градуса вышэй за норму. Гэтае паўгоддзе заняло другое месца ў ранжыраваным шэрагу ад самага цёплага да самага халоднага, пачынаючы з 1945 года. «Самае цёплае было першае паўгоддзе 1989 года з сярэдняй тэмпературай 7,4 градуса цяпла», — адзначыла **начальнік аддзела вывучэння змяненняў клімату службы метэаралагічнага і кліматычнага маніторынгу, фонду даных Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Наталля КЛЯВЕЦ.**

Гэты год пачаўся з анамальна цёплых студзеня і лютага з сярэднімі тэмпературамі плюс 1,1 і плюс 1,6 градуса адпаведна. Такі цёплы студзень адзначаны ў нашай краіне ўпершыню за ўсю гісторыю метэаназіранняў, а люты — другі раз. «У цэлым гэты зімовы сезон быў анамальна цёплы з сярэдняй тэмпературай плюс 1,5 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 5,5 градуса. Такой цёплай зімы на тэрыторыі нашай краіны не адзначалася ні разу за ўсю гісторыю метэаназіранняў», — адзначыла начальнік аддзела.

Сёлета халодны перыяд нават зімой назваць было нельга. Зіма, з пункту гледжання кліматолагаў, надыходзіць тады, калі сярэднясутачная тэмпература паветра апускаецца ніжэй за нуль і ўтрымліваецца на такой адзнацы больш за пяць дзён. У Беларусі на рубяжы 2019—2020 гадоў гэтага так і не адбылося, а значыць, кліматычнай зімы наогул не было.

Не было і ўстойлівага снежнага покрыва. Максімальная тэмпература паветра за каляндарную зіму была адзначана 18 снежня 2019 года ў Драгічыне і склала плюс 12,8 градуса. Мінімальная — 8 лютага на станцыі Езярышча (мінус 11,1 градуса). «Нягледзячы на анамальна цёплае надвор'е, якое мы адзначалі ў гэтым зімовым сезоне, абсалютныя максімумы тэмператур па месяцах не былі перавышаны», — дадала Наталля Клявец.

Мінулая вясна была звычайная, хоць не без сюрпрызаў. Сярэдняя тэмпература паветра перавысіла норму ўсяго на 0,2 градуса. Сакавік быў цёплы (у сярэднім плюс 3,6 градуса). Першы вясновы месяц з такой высокай тэмпературай адзначаецца ў сярэднім па краіне адзін раз на 10—15 гадоў. Красавік быў крыху халаднейшы, чым звычайна. У гэтым месяцы сярэдняя тэмпература была плюс 6,8 градуса, што ніжэй за норму на 0,5 градуса.

А май выдаўся халодны — у сярэднім плюс 11 (ніжэй за норму на 2,4 градуса). Апошні раз на тэрыторыі краіны такі халодны май быў адзначаны ў 1999 годзе. Максімальная тэмпература паветра за вясновы сезон была зафіксаваная 11 мая на метэастанцыі Жыткавічы і склала плюс 28,9 градуса. Мінімальная — 24 сакавіка ў Брэсцінскім запаведніку (мінус 10,9 градуса).

Лета злёгку «тармазнулася»

Устойлівы пераход праз адзнаку плюс 14 градусаў у бок павышэння сёлета адбыўся 5-6 чэрвеня. Такім чынам, кліматычнае лета пачалося на тыдзень-два пазней, чым звычайна. Чэрвень быў цёплы — з сярэдняй тэмпературай плюс 19,6 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 3,2 градуса. Ён заняў чацвёртае месца ў ранжыраваным шэрагу ад самага цёплага да самага халоднага. А самым цёплым гэты месяц быў у 2019 годзе.

На працягу чэрвеня 2020 года на метэастанцыях Лепель, Мар'іна Горка і Магілёў былі перавышаныя абсалютныя тэмпературныя рэкорды месяца. У Слаўгарадзе рэкорд быў паўторан. Максімальнае значэнне тэмпературы паветра за чэрвень адзначылі ў Жлобіне (плюс 34,4), мінімальнае — у Брэсцінскім запаведніку (плюс 3,2 градуса).

А з ападкамі «прарвала» ў чэрвені

Са студзеня да чэрвеня гэтага года ў сярэднім па краіне выпала 302 мм ападкаў, або 103 % ад нормы. Гэта значыць, рэжым увільгатнення быў блізкі да звычайнага. Але пры гэтым ападкі размяркоўваліся вельмі нераўнамерна.

У лютым, маі і чэрвені адзначалася залішняе ўвільгатненне. Больш за ўсё ападкаў за першае паўгоддзе выпала ў чэрвені — 104 мм (129 % нормы). У Брэсцінскім запаведніку ў чэрвені быў перавышаны гістарычны рэкорд месяца па суме ападкаў, калі выпала 231 мм (254 % нормы).

Недабор ападкаў адзначаўся ў студзені, сакавіку і красавіку. Найбольшы дэфіцыт быў у красавіку: выпала 13 мм (каля траціны месячнай нормы). У ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага сухога да самага вільготнага красавік 2020 года заняў чацвёртае месца.

На працягу першага паўгоддзя ў краіне адзначаліся ўзмацненні ветру да 15—27 м/с, месцамі туманы, галалёд і град. Навальніцы фіксаваліся нават у студзені, што з'яўляецца вельмі рэдкай з'явай для зімы.

Зіму адменяць як пару года?

У сувязі з павышэннем тэмпературы паветра сіноптыкі адзначаюць у Беларусі павелічэнне кліматычнага лета (за апошнія 30 гадоў — у сярэднім на 5-7 дзён) і скарачэнне зімы. «Сезоннасць клімату ў нас, вядома ж, захаваецца, бо яна абумоўлена астранамічнымі фактарамі, але поры года зменяцца», — сказала Наталля Клявец.

Яна адзначыла, што ў сувязі са зменнем клімату будзе павялічвацца колькасць небяспечных метэаралагічных з'яў. «На тэрыторыі нашай краіны за апошнія 30 гадоў не адзначаецца адназначнага росту іх колькасці. Але ў асобных відаў небяспечных з'яў можа павялічвацца паўтаральнасць. Напрыклад, небяспечная спяка (тэмпература паветра вышэй за 35 градусаў) адзначаецца ўсё часцей. Калі раней мы фіксавалі такое толькі па поўдні Беларусі (у Брэсцкай і Гомельскай абласцях), то цяпер тэмпературы, вышэйшыя за плюс 35, могуць адзначацца па ўсёй тэрыторыі краіны, паведаміла спецыяліст.

Што датычыцца другога паўгоддзя, то сярэдняя тэмпература паветра ў першай дэкадзе ліпеня склала плюс 19 градусаў, што вышэй за норму на 1,1 градуса. Апошні раз так цёпла ў першай дэкадзе ліпеня было ў 2015 годзе. Выпала ў сярэднім 31 мм ападкаў (109 % дэкаднай нормы).

Ураджай збожжавых будзе важкі

Надвор'е ў першым паўгоддзі абумовіла неадназначныя аграметэаралагічныя ўмовы на тэрыторыі краіны. Азімыя культуры паспяхова перанеслі ў цэлым бясснежную зіму, іх вегетацыя пачалася на месяц раней за сярэднія шматгадовыя тэрміны. Значна раней пачалася і масавая сяўба ранніх яравых культур.

«Затым умовы змяніліся. Хоць тэмпература ў сакавіку была вышэйшая за кліматычную норму, у цэлым вясна была халоднай. Нізкія начныя тэмпературы (у асобныя ночы да мінус 8—11 градусаў) сталі прычынай пашкоджанняў рапсу, на некаторых палях — нават гібелі», — сказала Святлана Кузьміч.

Нават багатыя дажджы ў маі пасля сухога красавіка не змаглі папоўніць запасы вільгаці. У некаторых раёнах Гомельскай вобласці фіксавалі гібель сельскагаспадарчых культур ад засухі.

У першы месяц лета аграметэаралагічнае становішча на тэрыторыі краіны прыкметна палепшылася. Багатыя дажджы ў чэрвені і першай палове ліпеня добра намачылі глебу і на асноўных масівах аднавілі добрую вільгацезабяспечанасць пасеваў. Дастатковасць цяпла і вільгаці спрыялі фарміраванню ўраджаю збожжавых, адрастанню траў пасля ўкосу і росту караняплодаў. Аднак частыя ападкі абцяжарылі ўборку сена і ахоўныя мерапрыемствы па доглядзе пасеваў. Моцныя дажджы з градам станавіліся прычынай палягання збожжавых, лёну і рапсу.

Што ж мы маем цяпер? Па поўдні, а месцамі і ў цэнтральным рэгіёне краіны ў азімых збожжавых і яравога ячменю назіраецца васковая спеласць, у некаторых раёнах ужо рэгіструюць поўную спеласць. «Збожжавыя культуры для ўборкі сёлета паспеюць трохі пазней, чым у мінулым годзе. Аднак нашы спецыялісты мяркуюць, што ўраджай збожжавых будзе большы, чым летась. Згодна з вынікамі апошніх абследаванняў пасеваў лёну, вышыня сцябла сёлета большая, чым у 2019 годзе. Праўда, пасля халоднай вясны пакуль адстае ў развіцці кукуруза», — заўважыла Святлана Кузьміч.

Сяргей КУРКАЧ.

Надвор'е

ЗНОЎ ПАЦЯПЛЕЕ, АЛЕ НЕНАДОЎГА

На наступным тыдні ў сераду стане халадней

Але пакуль — досыць цёплае надвор'е ў асноўным без ападкаў чакаецца ў нас у гэтыя выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Ужо сёння яно пачне змяняцца. Чакаецца пераменная воблачнасць. Удзень у асобных раёнах Гомельскай вобласці пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. А вось у выхадныя тэрыторыя краіны ў асноўным будзе знаходзіцца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Толькі ў паўднёва-заходніх раёнах, а ўдзень 19 ліпеня і па крайнім паўночным усходзе краіны адаб'ецца ўплыў няўстойлівых паветраных мас.

У суботу таксама чакаецца пераменная воблачнасць. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўднёвым захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 16 цяпла. Удзень будуць камфортныя 22—28 цяпла.

І ў нядзелю чакаецца пераменная воблачнасць, будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у асобных раёнах Брэсцкай і Віцебскай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Хутчэй за ўсё, раніцай чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да плюс 14 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 16 цяпла. У гэты дзень павялічыцца дзённая тэмпература — будзе 23—29 градусаў са знакам плюс.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е ў краіне абумовіць няўстойлівая цёплая паветраная маса паўднёвых шырот. У панядзелак чакаецца пераменная воблачнасць. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 да 17 градусаў цяпла, удзень будзе ўсё так жа горача — плюс 23—29 градусаў. У аўторак цёплае надвор'е захаваецца, а ў сераду пахаладае.

Сяргей ПАЛІНІН.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ВУП Кітая ў другім квартале вырас на 3,2 працэнта

Пра гэта сведчаць даныя, якія апублікавала дзяржаўнае статыстычнае бюро Кітая. Паказчыкі другога квартала аказаліся значна лепшыя, чым прагназавалі аналітыкі, якія чакалі, што эканоміка Паднябеснай на фоне значных поспехаў у барацьбе з эпідэміяй і поўнага аднаўлення вытворчасці вернецца да станоўчай дынамікі, але рост дасягне толькі 2,4 працэнта. Аб'ём валавога ўнутранага прадукту Кітая па выніках першага квартала пад уплывам эпідэміі каранавіруса ўпаў на 6,8 працэнта — кітайская эканоміка пайшла ў мінус упершыню з 1992 года. Улады КНР на фоне пандэміі і яе ўплыву на эканоміку не сталі вызначаць паказчыкі росту ВУП у 2020 годзе: звычайна адпаведныя мэты агучвае ў штогадовым дакладзе прэм'ер Дзяржсавета КНР Лі Кэцян на адкрыцці сесіі парламента, аднак сёлета гэтага не адбылося. Як вядома, па выніках 2019-га ВУП Кітая вырас на 6,1 працэнта, краіна захавала за сабой статус другой найбуйнейшай эканомікі свету.

Рэпер Канье Уэст зарэгістраваўся кандыдатам у прэзідэнты ЗША

Рэп-выканаўца зарэгістраваўся ў выбарчай камісіі штата Аклахома. Пра гэта сведчаць апублікаваныя звесткі мясцовага выбаркама. Уэст паспеў падаць неабходныя дакументы і заплаціць рэгістрацыйны збор у памеры 35 тысяч долараў. Паводле інфармацыі на сайце выбаркама, рэпер адзначыў, што будзе прадстаўляць партыю BDY (Birthday Party, што можна перавесці і як «Партыя дня нараджэння», і як «Вечарынка з нагоды дня нараджэння»). Такім чынам, як мінімум у Аклахоме прозвішча выканаўцы з'явіцца ў выбарчым бюлетэні. Па інфармацыі агенцтва Associated Press, у гэтым штаце незалежнымі кандыдатамі таксама зарэгістраваліся піяністка Джэйд Сіманс і бізнесмен Брок Пірс.

Астраномы выявілі белы карлік, які перажыў выбух звышновай

Успышка звышновай — гэта магутны выбух, які адбываецца бліжэй да завяршэння жыцця некаторых зорак. Але ў гэтым выпадку ўспышкі не хапіла для поўнага знішчэння белага карліка (зоркі, якая астывае) SDSS J1240+6710 — замест гэтага ён адправіўся перасякаць космас на хуткасці 900 тысяч кіламетраў у гадзіну. Астраномы мяркуюць, што гэты аб'ект першапачаткова круціўся вакол іншай зоркі, якая павінна была адляцець у процілеглы бок. Раней навукоўцы выявілі ў белага карліка незвычайны склад атмасферы. Гэта сумесь кісларoду, неону, магнію і крэмнію. Цяпер з дапамогай касмічнага тэлескопа «Хабл» міжнародная каманда навукоўцаў выявіла ў атмасферы белага карліка яшчэ і вуглярод, натрый і алюміній. «Гэта, верагодна, звышновая, але пэўнага тыпу, які нам раней не быў знаёмы», — адзначыў «Бі-бі-сі» вядучы аўтар даследавання прафесар Барыс Генсіке з Уорыкскага ўніверсітэта ў Вялікабрытаніі.

І СМЕХ І ГРЭХ

Што праўда, тое праўда: у гарадах цяпер шмат хто гадамі, а то і дзесяцігоддзямі, жыве з людзьмі ў суседстве і амаль нікога не ведае — хіба ў твар.

Нам у гэтым сэнсе «пашчасціла»: не паспелі мэблю ў кухні развесіць, як са столі ў куце закапала, а потым яшчэ і пацякло: нас затапілі.

У такіх выпадках хоць-нехаць пазнаёмішся з суседзямі.

Такім чынам, над намі, на пятым паверсе, жыве сям'я ў складзе бабулі Цімафееўны (ёй цяпер, мусіць, добра за 80?), яе дачкі Зоі, зяця Віктара і ўнучкі Наташы.

Якраз з ёй мы нядаўна ў гастраноме сустрэліся, у чарзе да касы стаялі, гаварылі, як водзіцца, аб тым, што хвалюе.

...Наташа пачала з таго, што цяпер яны ў кватэры ўдзвюх з бабуляй засталіся, што бацькі яшчэ ў сакавіку з'ехалі на дачу, у так званую самаізаляцыю. (Маці, маўляў, прызнала, што калі да яе інфарктаў яшчэ і вірус, то з хаты сама ўжо не выйдзе — выносіць давядзецца...). А вось бабуля пакуль што з імі не паехала — засталася дома.

...У тую раніцу яна яшчэ моцна спала. Наташа ўстала першая, пайшла на кухню, набрала з крана вады і скрывілася: пах быў, мякка кажучы, не з прыемных. «І чым гэта бабуля посуд памыла?» — падумала ўнучка і тут жа стала перамываць — кубкі, талеркі...

Часу на гэта ў яе бракавала (бо на работу ж трэба), а яшчэ меней... толку, бо пах чамусьці не сыходзіў, а наадварот, узмацняўся: нейкай брыдой стала несці не толькі ад посуду, але і ад губкі, якой яна карысталася, ад уласных рук.

Давялося схадзіць у ванны пакойчык, узяць усё новае, яшчэ раз «прайсціся» па талерках...

І зноў нічога не зразумець, бо пах не знікаў. «Значыць, справа не ў мыйных сродках? Не ў губцы і не ў бабулі? — рабіла высновы ўнучка. — Тады ў чым? Ці... у кім?»

Ад здагадкі Наташа аж села: «Што там пісалі пра каранавірус? Ага, што чалавек, захварэўшы на яго, не адчувае паху?.. Ё-маё, — спужалася жанчынка, — дык гэта ж пра мяне, бо адчуваю толькі адзін... Няўжо падчапіла?

Але ж дзе? Ад каго заразілася? З кім калі сустракалася? Каго магла заразіць сама? І што будзе далей? Хто прыгледзіць за бабуляй? Хто будзе ездзіць на дачу і вазіць прадукты бацькам? Што ўрэшце рабіць самой — вось зараз?..»

Пад цяжарам гэтых зусім нечаканых праблем у Наташы ўзмакрэла спіна. «Трэба, — падумала, — змераць тэмпературу». Да ўсяго ёй нясцерпна захацелася піць...

І добра, што бабуля трымае ў кухні графін...

Наташа наліла ў шклянку вады, паднесла да вуснаў і...

Ура: вада ў ёй пахла... вадою! А далей — «метадам спроб» — духі духамі, герань — геранню, шампунь — крапівой! Значыць, не ўсё так дрэнна?!»

Шчаслівая ад гэтай думкі, Наташа неяк забралася на работу і выбегла з кватэры...

Па лесвіцы, насустрач ёй, крочыў сусед з дзвюма бутлямі вады з крамы.

— З краніў нешта незразумелае сёння цячэ, — сказаў Наташы. — У санстанцыю і «Водаканал» ужо многія пазванілі. Там сказалі, што будуць разбірацца. А пакуль во — з магазіна нясу».

Збегала туды і Наташа: купіла вады (пад абед яе ў бочках у двор прывезлі), прыказала бабулі, каб пад кранам нават рукі не мыла.

...Былі, карацей, «прыгоды» з вадою ў двух раёнах сталіцы, у канкрэтных дамах і кватэрах.

Суседка расказала мне пра свае, дзякуй богу — са смехам.

А. Клімковіч,

г. Мінск.

ЯГО ЗВАЛІ МІША

...З дзяцінства марыла: вось вырасту, скончу інстытут і тады зажыву каралеўнай. Буду мець свой дом ці кватэру (гэта не вельмі важна)... Важна, што там будзе свая багатая бібліятэка і, вядома ж, каханы прынц...

Ён, як гэта часта здараецца, не дачакаўся, пакуль я вырасту: з'явіўся куды раней.

Мне было ўсяго 14, і ў нас у Віцебску афіцыйна адкрываўся парк. Падрыхтоўка да гэтай падзеі пачыналася загадзя: садзіліся дрэўцы на беразе Дзвіны, ствараліся скульптуры жанчыны з вясломі і вясёлых мядзведзікаў, будавалася лодачная станцыя, танцпляцоўка...

А побач з ёй напярэдадні з дошак скалацілі сцэну, і ўжо адтуль на ўсю моц грымела музыка, гучалі песні, байкі, вершы, паказвалі сваё майстэрства танцоры і фокуснікі. Але ж самае галоўнае было не гэта: стоячы сярод дзяўчат, я заўважыла, што ў мой бок пазірае ну такі прыгожы хлапчук...

З гэткай радасці (і, вядома ж, каб «з усіх бакоў паказацца»), я стала гучней смяяцца, рабіць нейкія заўвагі наконт няўдалых нумароў канцэрта, адбіваць далонькі пасля ўдалых... Сяброўкі мяне з ахвотай падтрымалі, і...

Справа была зроблена: той хлапчук падышоў да нас, мы разам сталі глядзець канцэрт, прычым ён таксама час ад часу казаў, што гэтую байку (тады яны часта гучалі са сцэны) трэба чытаць інакш...

Вось так мы сустрэліся з Мішам. Ён вучыўся ў іншай школе, але гэта нам ніколькі не перашкаджала. Мы сталі сустракацца, абмяркоўваць школьныя справы, адзнакі, кнігі, катацца на лодцы, хадзіць у кіно (тэлевізараў яшчэ не было)... Міша мне вельмі падабаўся, і я, што называецца, аж са скуры лезла — стараласа спадабацца яму — як Чэхаў пісаў, і тварам, і адзеннем, і душой, і думкамі.

А палёт іх тады быў вельмі высокі!

Я ў той час хадзіла ў гурток мастацкага чытання, сама трохі пісала вершы і на кожнай сустрэчы чытала іх Мішу. Да таго ж пастаянна нешта расказвала, каб паказаць, якая я — ні больш ні менш — найлепшая!

І чым болей я гэта рабіла — выступала, узвышала сябе — тым нейкім «ніжэйшым» і цішэйшым рабіўся Міша.

А ўрэшце ён аднойчы мне выдаў: «Слухай, ты такая таленавітая, такая разумная... А я? Я — ніхто ў параўнанні... Просты смяротны. Мы не пара з табой. Прабач».

Сказаўшы так, Міша... пайшоў! І пайшоў... назаўсёды.

Дурняў, кажуць, і ў царкве б'юць. Правільна робяць! Абы паразумнелі.

...Праз гады ўжо іншы хлопец, які вельмі хацеў мне спадабацца, спытаў:

— Слухай, я табе столькі пра сябе расказаў. А ты ўсё маўчыш і маўчыш. Чаму ты такая скрытная?..

Што мне было адказаць? Што мне ўжо трохі больш за 14? Што я такі падрасла і, відаць, крыху паразумнела?

(Ну сапраўды: не расказваць жа яму пра маё першае школьнае каханне? Пра тое, што яго звалі Міша?)

З. М.,

Глыбоцкі раён.

ПАСЛУХМЯНАЯ ДАЧКА

Праўду кажуць: што ні хата, то свой комін (і ў працяг — што ні шафа — свой шкілет).

Я здаўна і вельмі добра ведала гэтую сям'ю, шчыра паважала гаспадыню, абодвух гаспадароў, дзяцей... І толькі цяпер пачула, што не ўсё там было так проста.

Але ж па парадку.

У адным невялікім нашым гарадку жыла звычайная маладая пара, гадавала дваіх дзяцей. А потым скуль ні вазьміся хвароба... І галоўнае, як яны з ёй ні змагаліся, чаго ні рабілі — а справіцца не змаглі: засталася жанчына ўдавой.

Ёй, вядома ж, цяжка было, але рук не апусціла, хіба што грубаватая трохі зрабілася, не па гадах суровая... Што, як ні дзіўна, нават болей вабіла мужчын. Бо гэта ж не нейкая там шалахвостка ці «развядзёнка», а сур'ёзная жанчына, удава — дагледзела хворага мужа, адна гадуе дзяцей...

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2240.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 ліпеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

17 ліпеня 2020 г. № 26 (562)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Жыві і квітней, Беларусь!

Здароўе. Практычны падыход

ТЭМА ТЫДНЯ

Якаснасць і даступнасць — пастулаты сучаснай сістэмы аховы здароўя

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 4–14

ВОПЫТ

СТЫМУЛ ДЛЯ АКТЫВІСТА

Магілёўскі аблсавет вырашыў зрабіць персанальную намінацыю для старастаў і вулічкомаў

Сярод тых, хто стаў сёлета «Чалавекам года — 2019», — і староста вёскі Пуцькі Чавускага раёна Вольга АЎЧЫННІКАВА. Такім чынам у раёне вырашылі падтрымаць актывістку за яе адказную грамадскую пазіцыю. Яна шмат гадоў з'яўляецца сувязным звяном паміж жыхарамі вёскі і мясцовай уладай. Дзякуючы ёй насельніцтва далучаецца да грамадскай дзейнасці, стварае прыгажосць у месцах адпачынку, удзельнічае ў добраўпарадкаванні свайго населенага пункта.

— Такія людзі, як Вольга Аўчыннікава, — нашы асноўныя памочнікі ў грамадскай рабоце, — кажа **старшыня праўлення абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, старшыня Чавускага райсавета Анатоль МАЦЮЛІН.** — Мы пастаянна шукаем спосабы, як іх заахвоціць. Нядаўна такіх магчымасцяў стала болей. Асацыяцыя выступіла ініцыятарам таго, каб павялічыць колькасць намінацый у штогадовым спаборніцтве сярод органаў мясцовага самакіравання, якое праводзіцца па лініі аблсавета і аблвыканкама. І нас падтрымалі. Будуць яшчэ тры намінацыі для індывідуальных органаў самакіравання — старастаў, старшынь па доме і гэтак далей. Яны змогуць атрымаць за сваю дзейнасць 30, 20 і 15 базавых велічынь — у залежнасці ад месца.

стар. 16

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Ведаць праблемы

Як жывецца вяскоўцам, высвятлялі ўдзельнікі пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. стар. 3

Над чым працуем?

Якія законы ў сферы аховы здароўя атрымаюць навацыі і чаго яны датычацца? стар. 4

Будзе камфортна!

Новая паліклініка, разлічаная на абслугоўванне 40 тысяч чалавек, у хуткім часе адкрыецца ў Гомелі. стар. 13

Інвестыцыі ў здароўе

Сёлета на рэканструкцыю і мадэрнізацыю ўстаноў аховы здароўя Віцебшчыны выдаткавана 19,5 мільёна рублёў. стар. 14

Аналіз у... кантэйнеры

Бескантактавая модульная лабараторыя пачала дзейнічаць у Гродне. стар. 14

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Мясцовыя ўлады павінны чуць людзей і дапамагаць ім

Такую думку выказала старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА па выніках прыёму грамадзян, які правяла на базе цэнтральнай грамадскай прыёмнай РГА «Белая Русь»

З 15 ліпеня ва ўсёй краіне стартавала дзейнасць 150 грамадскіх прыёмных, куды грамадзяне могуць прыходзіць са сваімі пытаннямі.

— Сёння работа праходзіла вельмі эфектыўна і плённа. Людзей прыйшло дастаткова шмат — з пытаннямі, прапановамі, пажаданнямі, якія заслугоўваюць увагі. Звярталіся не толькі грамадзяне з асабістымі пытаннямі, але і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, — падсумавала для журналістаў вынікі прыёму Наталля Качанава.

А людзей хвалявалі розныя пытанні: ад традыцыйных жыллёва-камунальнай накіраванасці да лакальных, — напрыклад, па забеспячэнні прафілактычным лячэннем асобнай катэгорыі хворых. У любым выпадку, заяўнікі сюды прыйшлі са сваёй праблемай. Вялікай ці маленькай — гэта не так важна, калі яна хвалюе і рупіць. Спікер верхняй палаты парламента за амаль чатырохгадзінны прыём паспела ўнікнуць больш чым у 20 пытанняў рознага маштабу, уважліва выслухала кожнага заяўніка, а з тымі, з кім не давялося пагутарыць у адведзены тэрмін, паабяцала сустрэцца падчас дадатковага прыёму, які арганізуюць у найбліжэйшы час.

Фота БелТА.

> Давайце так: 1 кастрычніка мы сустрэнемся, прыедзем і праверым, як выканана абяцанне, — прапанавала Наталля Качанава, з чым заяўнікі з задавальненнем пагадзіліся.

«Квадраты» разладу

Вырашэнне кватэрнага пытання прывяло ў грамадскую прыёмную не аднаго сталічнага жыхара. Павел Сцепаненка ад імя ветэранаў вайны ў Афганістане агучыў пажаданне, каб такой катэгорыі грамадзян, якія да гэтага часу маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, даць магчымасць будавацца больш. Надзея Федарцова прыйшла ад імя дольшчыкаў даўгабуда ў межах вуліцы Быхаўскай з просьбай, каб забудоўшчык здаваў два пускавыя комплексы (176 кватэр) адначасова, а не паасобку — спачатку першы, а пазней другі пад'езды. Людзі маюць справядлівыя падставы хвалявацца, што кошт другой часткі будаўніцтва можа істотна павысіцца.

Сацыяльныя сіроты Уладзімір Маркаў з братам выраслі ў апякунскай сям'і, па дасягненні паўналецця атрымалі двухпакаёўку сацыяльнага карыстання і хацелі б яе прыватызаваць. Але ёсць заканадаўчыя абмежаванні, таму хлопец і прыйшоў на прыём да Наталлі Качанавай, каб даведацца, ці існуе магчымасць выкупіць у дзяржавы гэтае жыллё. Пенсіянерка Лілія Андрэеўна жалілася на тое, што жыве ў прыватным доме амаль у цэнтры сталіцы, а выгод няма ніякіх — маўляў, у вёсцы лепшыя ўмовы. Таму і пыталася, калі, нарэшце, іх хаты будуць знесены, а іх жыхары ўзамен атрымаюць кватэры. У той жа час для іншай заяўніцы Ніны Віктараўны, што валодае паловай дома больш чым на сто «квадратаў» на вуліцы Ціміразева, наадварот, такая прапанова ад забудоўшчыка абуральная. Яна не жадае мець узамен дзве аднапакаёўкі, тым больш на дзясятым паверсе, бо яна інвалід і яе гэта не задавальняе... Не можа даць рады з таварыствам уласнікаў Вікторыя Латушка, якая набыла памяшканне для вядзення гаспадарчай дзейнасці (у прыватнасці, арганізацыі работы трэнажорнай залы) па вуліцы Васняцова, але да гэтага часу не можа атрымаць ад яго дазволу.

Безумоўна, у кожным з такіх зваротаў трэба разбірацца дэтальна. Спікер Савета Рэспублікі запэўніла заяўнікаў, што па кожным з іх пытанняў абавязкова будзе праведзены разбор. Калі ёсць магчымасць па законе вырашыць пытанне на карысць чалавека, так і будзе зроблена.

Колькі ў кішэні?

Уласныя даходы сталі нагодай для таго, каб агучыць сваю праблему, у мінчаніна Аляксандра Жука. Ён паведаміў, што калі працаваў у прыватнай фірме ў Мачулішчах, уласнік аказаўся яму вінен вялікую суму грошай — нясвоечасова выплачваў зарабленае. Ды не толькі яму. Па словах заяўніка, у судзе ўжо разглядалася гэтая справа і 135 чалавек прызнаны пацярпелымі. Цяпер мужчына працуе ў іншым месцы, але былы работадавец да гэтага часу не разлічыўся ні з ім, ні з іншымі, таму Аляксандр прыйшоў, каб паведаміць аб невыкананні судовага рашэння. Старшыня Савета Рэспублікі даручыла Мінаблвыканкаму дэталёва разабрацца ў справе, а старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргею Сіўцу падключыцца да вырашэння гэтага пытання.

Вольга Пятроўна як жонка афіцэра ў свой час паматалася па свеце, а па дасягненні пенсійнага ўзросту атрымала невялікую пенсію. Вось і прыйшла з пытаннем, ці можна ўлічыць даходы, што атрымлівала ў валюце падчас камандзіроўкі мужа ў Германіі. Адпаведнае даручэнне было адрасавана міністру працы і сацыяльнай абароны Ірыне Касцевіч — асабіста разабрацца і даць адказ.

Бяспека перш за ўсё!

Калектыўны зварот жыхароў пасёлка Сонечны агучыла Кацярына Секан: людзі хацелі б, каб на перакрыжаванні дарог Калодзішчы—Заслаўе з'явіўся святлафор, бо месца гэтае аварыйна небяспечнае, аўтамабільны рух дастаткова інтэнсіўны. Жыхары пасёлка звярталіся ў Мінскі райвыканкам, але тэрміны ўводу аб'екта ўвесь час пераносяцца. Хутка 1 верасня, і людзі хвалююцца за дзяцей, якія адправяцца пасля канікул у школу.

Як растлумачыў генеральны дырэктар КУП «Мінскаблдарбуд» Дзяніс Сцяпанаў, на сёння ўжо распрацаваны будаўнічы праект, які ў тым ліку прадугледжвае і пашырэнне дарогі. 10 ліпеня дакументацыю перадалі на дзяржаўную экспертызу. Генеральны дырэктар паабяцаў, што да канца верасня святлафор запусцяць у эксплуатацыю.

— Давайце так: 1 кастрычніка мы сустрэнемся, прыедзем і праверым, як выканана абяцанне, — прапанавала Наталля Качанава, з чым заяўнікі з задавальненнем пагадзіліся.

Патрэбная дапамога

Пенсіянерка Вольга Радчанка агучыла непаразуменні, якія ўзніклі ў стасунках з мясцовай паліклінікай, дзе абслугоўваюцца яна і яе 90-гадовая маці. Спікер Савета Рэспублікі звязалася з першым намеснікам міністра аховы здароўя Дзмітрыем Піневічам і даручыла яму асабіста сустрэцца з жанчынамі і дапамагчы вырашыць спрэчныя пытанні з установай аховы здароўя.

Тэму медыцынскага абслугоўвання працягнула Святлана Леанідаўна, якая прадстаўляла таварыства хворых на гемафілію. Жанчына расказала, што такія пацыенты да дасягнення 18-гадовага ўзросту атрымліваюць прафілактычнае лячэнне, а пасля — толькі па факце траўмы, інакш кажучы, без пастаяннай прафілактыкі інвалідызацыя пацыентаў з цяжкай формай гэтага захворвання надыходзіць вельмі хутка. Што трэба? Дапамагчы ў прыняцці адпаведнага закона, які датычыцца прафілактыкі гэтага захворвання ў дарослых пацыентаў. Такое даручэнне па выніках гутаркі Наталля Качанава адрасавала прэм'ер-міністру і міністру аховы здароўя.

Трэба сказаць, што ніводны са зваротаў, агучаных падчас прыёму грамадзян, не будзе пакінуты без увагі. Наталля Качанава ў размове з журналістамі акцэнтавала ўвагу на тым, што ў краіне прыняты закон аб зваротах грамадзян, згодна з якім усе службовыя асобы павінны праводзіць прыёмы па асабістых пытаннях, сустракацца з людзьмі, слухаць іх праблемы і аказваць усякае садзейнічанне ў іх вырашэнні. Большасць пытанняў, як правіла, датычыцца работы мясцовай улады, цяперашні прыём не стаў выключэннем.

— Хацелася б, каб людзей на месцах чулі і дапамагалі ім у вырашэнні пытанняў, якія ў іх узнікаюць, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента.

Вольга АНУФРЫЕВА.

УСЕ ЗВАРОТЫ БЯРУЦЦА НА КАНТРОЛЬ

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ правёў прамую тэлефонную лінію, адказаў на злабадзённыя пытанні і выказаў шэраг слушных парад.

Званкі былі на розныя тэмы, але пераважна тычыліся праблем і пытанняў, якія чамусьці не вырашаюцца прадстаўнікамі органаў мясцовай улады ў рэгіёнах. Так, у жыхара Пінска не атрымоўваецца знайсці агульную мову па заблытаным зямельным пытанні ні з райвыканкамам, ні з абласнымі і рэспубліканскімі ўстановамі і арганізацыямі, куды ён звяртаецца. Паводле яго слоў, ужо назбіралася 14 кілаграмаў адпісак, а станоўчых зрухаў няма. З гэтай нагоды ён рашуча і эмацыянальна патрабуе разабрацца з выездам на месца ў Пінск.

Зразумела, эмоцыі — не самы лепшы аргумент пры разглядзе спрэчных юрыдычных пытанняў, асабліва зямельных, якія традыцыйна з'яўляюцца няпростымі ў вырашэнні. Таму Сяргей Сівец прапаноўвае мужчыну адказаць на ўдакладняючыя пытанні, каб потым даць абгрунтаваны адказ.

Месяц таму падчас прамой тэлефоннай лініі адна жанчына з Салігорска паскардзілася Сяргею Сіўцу на тое, што ў горадзе зацягваецца ўзвядзенне жылля для шматдзетных сем'яў. Тады сенатар дэталёва вывучыў пытанне, у адпаведныя тэрміны праінфармаў маці пра захады і меры, якія прымаюцца. І вось — зноў аналагічны званок з Салігорска: чаму там не спяшаюцца будаваць кватэры для шматдзетных? Цяпер старшыня Пастаяннай камісіі адразу назваў галоўную прычыну пераносу ўводу ў эксплуатацыю жылога дома: яго праектна-каштарысная дакументацыя не была своечасова падрыхтавана. Цяпер гэтая хіба выпраўлена, і жыллё будзе гатова для засялення ў першым квартале наступнага года. Прычым у эксплуатацыю адразу здадуць два дамы з кватэрамі для шматдзетных сем'яў.

Па кватэрным пытанні патэлефанавала і жанчына з Гомельскага раёна. У яе дачкі дзіця — інвалід. Адсюль і пытанне: ці мае права дачка стаць на льготную чаргу для атрымання жылля ў доме, які пачалі ўзводзіць у іх пасёлку? Сяргей Сівец папрасіў жанчыну даслаць копіі ўсіх дакументаў, якія ёсць у сям'і па гэтым пытанні, каб высветліць рэальныя правы дачкі на атрыманне кватэры, бо з адной тэлефоннай размовы складана скласці аб'ектыўнае ўражанне па гэтай сітуацыі.

Старшыня Пастаяннай камісіі, каментуючы журналістам вынікі прамой тэлефоннай лініі, адзначыў, што ўсе пытанні, з якімі грамадзяне звяртаюцца ў Савет Рэспублікі па тэлефоне ці ў пісьмовай, электроннай форме, бяруцца на кантроль. Выкананне гэтых зваротаў строга адсочваецца. Напрыклад, уважліва маніторыцца сітуацыя ў Салігорску з тэрмінамі будаўніцтва жылля для шматдзетных сем'яў.

Падчас прамой тэлефоннай лініі, адзначыў сенатар, прадстаўнікі ўлады імкнуцца даць поўны адказ грамадзяніну, калі гэта магчыма, а таксама пракансультаваць, растлумачыць асаблівасці выкарыстання таго ці іншага закона, параіць, як дзейнічаць выключна ў прававым полі для абароны сваіх правоў і інтарэсаў. А гэта — часцей за ўсё званкі па жыллёвых і зямельных пытаннях, маёмасныя спрэчкі з іншымі спадчыннікамі і жыццёвыя праблемы. Усе яны павінны вырашацца толькі па законе, падкрэслівае сенатар.

Леанід ТУГАРЫН.

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

МАЛА ВАЛОДАЦЬ СІТУАЦЫЯЙ — ТРЭБА ВЫРАШАЦЬ ПРАБЛЕМЫ

Калі ёсць жаданне на свае вочы ўбачыць рэальныя перавагі жыцця ў вёсцы, то прыязджайце ў аграгарадок Гарадзішча Шклоўскага раёна, як гэта днямі зрабілі ўдзельнікі выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі.

ТАК БЫ ЎСЮДЫ...

А пачалося яно нефармальна — не з традыцыйнага выбрання прэзідыума, агучвання праграмы пасяджэння, а з кранаючай прывітальнай песні мясцовых самадзейных артыстаў. Яны шчыра і ад сэрца праспявалі пра любімы Шклоў — горад юнацтва, малой радзімы, месца першага кахання. Пачулі госці песню і аб прыгожым, заможным, нясумным і — сугучна тэме пасяджэння — камфортным жыцці ў аграгарадку Гарадзішча.

Вядома, сюды ўдзельнікі Савета па ўзаемадзеянні завіталі невыпадкова. Пасяджэнне было прысвечана абмеркаванню дзейнасці мясцовай улады па ўстойлівым развіцці тэрыторый, у тым ліку і стварэнні камфортных умоў для людзей. Дык вось, нават пасля кароткага знаёмства з Гарадзішчам, непрацяглых размоў з яго жыхарамі адчувалася, што ў гасцей уражанне ад візіту засталося моцнае. І не дзіўна, што сюды, у глыбінку, з'яўляецца ўсё больш ахвотных пераехаць на сталае жыхарства. Для гэтага адказнага кроку ў маладых людзей узнікаюць, паверце, важкія прычыны.

Як, напрыклад, у сацыяльнага педагога Гарадзішчанскай сярэдняй школы Наталлі Балбатовіч, якая трапіла сюды па размеркаванні. Гасцям яна прызналася, што спачатку думала адпрацаваць свой тэрмін і з'ехаць у горад. Але паступова гэтае жаданне пачало знікаць. Ёй спадабалася, як наладжаны жыццё і адпачынак у Гарадзішчы, у тым ліку і для моладзі. Тут у крокавай даступнасці Дом культуры, дзе ў святы ладзяцца вясёлыя імпрэзы, праводзяцца вечарыны. Побач дзве крамы, якія канкурыруюць за спажыўца, імкнуцца дагадзіць яму, развіваюць гандаль па папярэдніх заказах па інтэрнэце. Яны ажыццяўляюць дастаўку буйнагабарытных рэчаў — скажам, мэблі, бытавой апаратуры ці будаўнічых матэрыялаў — проста на месца выкарыстання. Ёсць служба быту, амбулаторыя, пошта, аддзяленне Беларусбанка, бібліятэка, дысказал і многае іншае. Ды і сам пасёлак чысты, утульны, а прыгожыя наваколлі так і вабяць.

Апошнім аргументам на карысць таго, каб застацца ў Гарадзішчы, стала выдзяленне Наталлі як маладому спецыялісту арэнднага жылля — асобнай добраўпарадкаванай кватэры. Яна, дарэчы, знаходзіцца ў будынку рэканструяванага і перабудаванага дзіцячага садка. Ён цяпер займае там палову плошчаў, а другая палова аддадзена пад адна- і двухпакаёвыя кватэры. І, заўважце, не ўсе яны занятыя. Напрыклад, сваё жыллё чакае ветурача, іншых спецыялістаў, у якіх гаспадарка мае патрэбу.

Фота БелТА.

Такая жыллёвая палітыка ў Гарадзішчы — важны фактар замацавання маладых кадраў. Разам са стварэннем развітой інфраструктуры яна прыносіць плён. На перспектыву цяпер пераабсталёўваюць былы будынак сельсавета. Тут з часам з'явіцца яшчэ сем новых камфартабельных арэндных кватэр з гарадскімі выгодамі.

ЖЫЦЬ НЕ ГОРШ, ЧЫМ У ГАРАДАХ

Ужо ў Шклове, дзе была працягнута работа пасяджэння Савета, **старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** падсумавала ўбачанае ў Гарадзішчы. Па яе словах, наяўнасць жылля, месца работы, добрая заработная плата — вось тое, што дазваляе маладым людзям замацавацца ў вёсцы. У Гарадзішчы мясцовая ўлада ўдзяляе вялікую ўвагу гэтым пытанням. А ўвогуле, заўважыла спікер верхняй палаты парламента, камфортнае пражыванне людзей у кожным населеным пункце краіны — адзін з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай палітыкі. Каб чалавеку было зручна жыць, трэба ствараць для гэтага развітую інфраструктуру. Дзіцячыя сады, школы, пошта, банкі, гандлёвыя аб'екты — усё гэта павінна быць.

Падчас пасяджэння Наталля Качанава звярнулася да дэпутатаў Саветаў усіх узроўняў з заклікам браць актыўны ўдзел у сацыяльна-эканамічным развіцці краіны ў цэлым і кожнага асобна ўзятага раёна ці горада, таму што менавіта дэпутаты як выбраннікі народа павінны як ніхто ведаць тыя пытанні, якія хвалююць людзей. Для фарміравання камфортнага іх жыцця ёсць усе сродкі, і неабходна далей дзейнічаць у гэтым кірунку, але сёння мала валодаць сітуацыяй — трэба прымаць меры па вырашэнні гэтых праблем, сказала Наталля Качанава.

Такая думка стала лейтматывам работы Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Зацікаўленая размова ў Шклове ішла аб шляхах раўнамернага развіцця рэгіёнаў, стварэнні ўмоў камфортнага жыцця людзей у кожным населеным пункце краіны. **Міхаіл РУСЫ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні,** у размове з журналістамі сказаў, што аграгарадкі, насуперак меркаванням розных крытыкаў і скептыкаў, на практыцы паказалі сваю неабходнасць і жыццяздольнасць. Там застаюцца людзі. Бо калі ў населеным пункце няма дзіцячага садка, школы, Дома культуры, амбулаторыі — карацей, развітой сацыяльнай сферы і інфраструктуры, — туды не паедуць жыць. Мы павінны стварыць такія ўмовы, пры якіх у малых населеных пунктах людзі змогуць працаваць, зарабляць і жыць не горш, чым у гарадах, лічыць Міхаіл Русы.

Старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Юрый НАРКЕВІЧ у сваем выступленні засяродзіўся на мерах падтрымкі дзелавой ініцыятывы ў глыбінцы, развіцця партнёрства мясцовага бізнесу і органаў самакіравання, прывёў цікавыя прыклады. Ён прапанаваў прыняць рэспубліканскую праграму асфальтавання вясковых вуліц.

Увогуле на пасяджэнні дэпутаты прадметна гаварылі і пра дарогі мясцовага значэння, і пра ўзвядзенне жылля для шматдзетных сем'яў, і пра многае іншае, што складае сутнасць работы сельсаветаў, раённых, гарадскіх і абласных Саветаў.

Першы намеснік міністра эканомікі Юрый ЧАБАТАР назваў прыярытэты для краіны на наступныя пяць гадоў, акрэсліў асобныя арыенціры і планы ўстойлівага і эфектыўнага развіцця рэгіёнаў. Калі вельмі лаканічна, то іх эканамічны рост, у прыватнасці, мяркуецца ажыццяўляць за кошт стварэння новых рабочых месцаў, асабліва ў тых сельскіх раёнах, якія нярэдка з аб'ектыўных прычын адстаюць у эканамічным развіцці. Да такіх раёнаў будуць падыходзіць індывідуальна з улікам іх асаблівасцяў.

Іх падтрымку ўраду неабходна актывізаваць, адзначыла ў ходзе пасяджэння і старшыня Савета Рэспублікі. Сёння, калі складаюцца планы на новую пяцігодку, дэпутаты павінны ўдзельнічаць у распрацоўцы і рэалізацыі гэтых дакументаў.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

НА ШЛЯХУ ДА МЭТ

Важны элемент устойлівага развіцця

У Беларусі вядзецца сістэмная работа па павелічэнні долі электратранспарту

Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Анатоль ІСАЧАНКА на Дні электратранспарту ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».

— У Беларусі вядзецца сістэмная работа па ўкараненні аўтаматызаваных сістэм кіравання перавозачным працэсам, павышэнні ўзроўню інфарматызацыі транспартнага комплексу, пашырэнні электрыфікацыі чыгуначных шляхоў і павелічэнні долі электратранспарту. Усё гэта забяспечвае камфортныя ўмовы пражывання нашых грамадзян і ляжыць у аснове канцэпцыі разумных гарадоў, якія мы развіваем, — адзначыў віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

Паводле яго слоў, паўсюднае ўкараненне зялёных тэхналогій, заснаваных на энерга- і рэсурсазберажэнні, забяспечвае развіццё эканомікі без шкоды для экалогіі. Гэта адна з Мэт устойлівага развіцця.

— Выдатна, што беларускія прамысловыя прадпрыемствы паэтапна пашыраюць мадэльны шэраг электратранспартнай тэхнікі, якая выпускаецца. Па гарадскіх маршрутах ужо курсіруе больш за 80 электробусаў, на дарогах павялічваецца колькасць легкавых аўтамабіляў, якія функцыянуюць на электрычнасці. Усё гэта дазваляе скарачаць шкодныя выкіды ў атмасферу, умацоўваць экалагічную бяспеку і, што не менш важна, развіваць інавацыйныя вытворчасці, якія фарміруюць аснову інтэлектуальнай эканомікі, — падкрэсліў ён.

Кажучы пра Дзень электратранспарту ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень», Анатоль Ісачанка звярнуў увагу на тое, што гэта добрае мерапрыемства для прэзентацыі найноўшых распрацовак у галіне электратэхнікі.

— Тут прадстаўлены розныя віды электратэхнікі — ад сучасных электробусаў да электраскутараў. Тэма для нас вельмі актуальная і перспектыўная. Абнаўленне парку транспартных сродкаў высокаэфектыўнай, бяспечнай і экалагічнай тэхнікай — важны элемент устойлівага развіцця нашай краіны, — дадаў ён.

Намеснік міністра прамысловасці Андрэй Буйневіч адзначыў, што электрамабіль — больш ёмістае паняцце, чым проста аўтатранспарт. Паводле яго слоў, гэта комплексная інфраструктура зарадных станцый, спецыялізаваных станцый тэхнічнага абслугоўвання, а таксама навучанне спецыялістаў, якіх неабходна ўжо сёння рыхтаваць, каб развіваць гэты кірунак у далейшым.

— Мы бачым вялікую перспектыву ў першую чаргу ў камерцыйным транспарце. Мінскі аўтамабільны завод у найбліжэйшы час павінен выпусціць каля 20 адзінак тэхнікі. Мінскі трактарны завод вырабіў і выпусціў узор лёдазаліўнай машыны, якая сёння праходзіць выпрабаванні на лядовых арэнах Мінска. У бліжэйшай перспектыве плануецца вырабіць каля 25 такіх адзінак, — паведаміў намеснік міністра.

Дарэчы, Дзень электратранспарту зладзілі ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень». На яго тэрыторыі дзейнічала дэманстрацыйная пляцоўка, дзе былі прадстаўлены розныя мадэлі электратранспарту — ад электробусаў і электрамабіляў да электраматацыкла і электрасамакатаў. У мерапрыемстве ўдзельнічалі МАЗ, «Белкамунмаш», Аб'яднаны інстытут машынабудавання НАН, прыборабудаўнічы завод «Аптрон», ВА «Беларуснафта», Geely, кампаніі-рэзідэнты індустрыяльнага парка «Вялікі камень» — «ЕЕС-груп», «Чанду Сіньчжу», Greencars. Арганізатарамі выступілі Міністэрства энергетыкі і Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

Паводле БелТА.

КАМПЕТЭНТНА

Віктар ЛІСКОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:

— На разглядзе ў нашай Пастаяннай камісіі зараз знаходзяцца сем законапраектаў. Асноўныя — нарматыўна-прававыя акты «Аб ахове здароўя», «Аб псіхалагічнай дапамозе» і «Аб донарстве і прэпаратах крыві». Не так даўно былі адобраны змены закона «Аб лекавых сродках». Важна, што ўводзіцца ўмоўная дзяржрэгістрацыя арыгінальных лекавых сродкаў для лячэння, прафілактыкі ці дыягностыкі сур'ёзных інвалідызуючых захворванняў ці тых, што пагражаюць жыццю; сродкаў, прызначаных для лячэння рэдкіх захворванняў пры адсутнасці эфектыўных метадаў аказання медыцынскай дапамогі. Гэта адчуваецца цяпер, калі за больш кароткі тэрмін можна атрымаць рэгістрацыйныя пасведчанні на тыя сродкі, якія вельмі неабходныя для ліквідацыі выбуху захворвання ці канкрэтнага лячэння групы хворых, што скарацілі тэрміны набыцця гэтых лекаў.

Законапраект «Аб ахове здароўя» прадугледжвае комплексную планавую карэкціроўку існуючага нарматыўна-прававога акта, па сутнасці, гэта новая рэдакцыя закона. Сярод навацый, у прыватнасці, удзелена значная ўвага экспертызе якасці медыцынскай дапамогі, бо якасць — гэта развіццё медыцыны. Акрамя таго, інфарматызацыі і электроннай ахове здароўя адведзены цэлы шэраг пытанняў. Уводзіцца клініка-эканамічная экспертыза медыцынскай дапамогі — гэта ацэнка правільнасці аказанай медыцынскай дапамогі з аптымальнымі затратамі. Між іншым, прадугледжваецца і медыцынская акрэдытацыя дзяржаўных арганізацый аховы здароўя. Што з гэтага вынікае? Яны павінны адпавядаць свайму статусу. Калі ён не будзе пацвярджацца, то ўстанова аховы здароўя будзе акрэдытавацца на ніжэйшы парогавы ўзровень. Увядзенне акрэдытацыі паспрыяе ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы, аснашчэнню абсталяваннем устаноў аховы здароўя, а ў канчатковым выніку гэта паўплывае і на якасць. Пакуль гаворка ідзе пра дзяржаўныя ўстановы аховы здароўя, таму што прыватныя развіваюцца згодна з патрабаваннямі часу.

Асобна хацелася б спыніцца на прапанове ўвядзення паняцця «ўніверсітэцкая клініка». На прыкладзе Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы створана першая ў краіне эксперыментальная ўніверсітэцкая клініка. Мяркую, што вопыт будзе распаўсюджвацца ў краіне і далей, калі сінергізм патэнцыялу навукоўцаў і практыкаў пачне станоўча адбівацца на развіцці медыцыны і яе якасці.

Таксама ў законапраекце прапануецца пашырыць кола суб'ектаў, якія ўпаўнаважаны на правядзенне медыцынскага агляду (у тым ліку ўрачэбна-экспертных, медыка-экспертных і ўрачэбна-лётных экспертных камісій). Па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўводзіцца норма аб рэзідантуры. Адрозненне яе ад традыцыйнай ардынатуры з'яўляецца магчымасць змены профілю медыцынскай спецыяльнасці.

Змены ў законе «Аб аказанні псіхіятрычнай дапамогі» прадугледжваюць прывядзенне яго нормаў у адпаведнасць з прынятымі апошнім часам заканадаўчымі актамі, перш за ўсё ўказам Прэзідэнта «Аб удасканаленні ліцэнзавання», які выключыў псіхалагічную дапамогу з пераліку ліцэнзаваных відаў дзейнасці, у сувязі з чым з закона выдаляюцца ўсе палажэнні аб неабходнасці атрымання псіхолагам адпаведнай ліцэнзіі для аказання псіхалагічнай дапамогі. Пры гэтым астатнія патрабаванні да гэтых спецыялістаў застаюцца без змен (напрыклад, адукацыя і іншыя).

Якаснасць і даступнасць — пастулаты сучаснай сістэмы аховы здароўя

Сёння ахова здароўя Рэспублікі Беларусь — гэта 4-узроўневая сістэма аказання медыцынскай дапамогі з арганізацыйна выбудаванай структурай ад фельчарска-акушэрскіх пунктаў да рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў.

Галоўнае ведамства ў сферы — Міністэрства аховы здароўя — рэалізуе дзяржаўныя праграмы: «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» і «Дзяржаўная праграма развіцця фармацэўтычнай прамысловасці Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады». Працягвае дзейнічаць і Праграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на перыяд да 2020 года.

> Асаблівая ўвага ўдзяляецца даступнасці медыцынскай дапамогі, дааснашчэнню і развіццю міжраённых і міжрэгіянальных цэнтраў. На іх абнаўленне накіраваны і мадэрнізаваны закон «Аб ахове здароўя».

Тэрмін дзеяння ўсіх гэтых праграм скончыцца сёлета. Але ўжо апублікаваны вынікі за мінулы год. Эфектыўнасць рэалізацыі праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» прызнана высокай. Так, з 2016 года пастаянна павялічваецца доля дактароў агульнай практыкі ад агульнай колькасці ўчастковых урачоў-тэрапеўтаў.

Па звестках Белстата, колькасць урачоў-практыкаў у Мінску на 2019 год склала 59,9 на 10 тысяч чалавек, і гэта самы высокі паказчык у краіне. На другім месцы Гродзеншчына з каэфіцыентам 53,6. Апошняе месца па забяспечанасці дактарамі ў Мінскай вобласці — 33,7.

Расце ўдзельная вага пацыентаў са злаякаснымі пухлінамі на I—II стадыях захворвання ў агульнай колькасці пацыентаў з выяўленымі ў працэсе скрынінгу злаякаснымі новаўтварэннямі, зніжаецца смяротнасць хворых на сухоты, усё больш ВІЧ-пазітыўных пацыентаў ахоплівае камбінаваная антырэтравірусная тэрапія.

На фінансаванне праграмы планавалася летась выдаткаваць 6 мільярдаў 151 мільён рублёў. Асвоена крыху больш — 101,3 % ад сумы. Сярод асноўных мерапрыемстваў дзяржаўнага праекта «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» — падрыхтоўка Нацыянальнай мадэлі службы планавання сям'і на 2019—2024 гады. Яна прадугледжвае развіццё ўмоў па абароне рэпрадуктыўнага здароўя насельніцтва. Праект уключае мерапрыемствы па ўдасканаленні прафілактыкі і лячэння адпаведных хвароб. Указам Прэзідэнта ў 2013 годзе грамадзяне маглі атрымаць ільготны крэдыт на ЭКА, а ўжо ў 2021 годзе Указ № 171 «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян» дае магчымасць правесці адну бясплатную спробу ЭКА за кошт дзяржавы. Гэта, безумоўна, паўплывае на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне. На жаль, сёння прыкладна кожная шостая пара ў Беларусі пакутуе ад бясплоднасці.

У амбулаторна-паліклінічных арганізацыях краіны працуе 3,7 тысячы ўрачоў агульнай практыкі. На 1 студзеня 2020 года іх доля ў колькасці дактароў, якія працуюць у сістэме аказання першаснай медыцынскай дапамогі, склала 82,5 працэнта.

Айчыннай стаматалагічнай навуковай школай распрацаваны і ўкаранёны новыя метады дентальнай імплантацыі і 3D-пратэзавання з выкарыстаннем лічбавых і ультрагукавых тэхналогій. Такія навацыі дазваляюць павысіць эфектыўнасць традыцыйнага лячэння.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца даступнасці медыцынскай дапамогі, дааснашчэнню і развіццю міжраённых і міжрэгіянальных цэнтраў. На іх абнаўленне накіраваны і мадэрнізаваны закон «Аб ахове здароўя».

У красавіку 2008 года ўпершыню ў Беларусі група ўрачоў 9-й гарадской клінічнай бальніцы правяла аперацыю па перасадцы печані, праз тры гады спецыялісты перасадзілі печань 20-месячнаму дзіцяці. У 2009 годзе ў РНПЦ «Кардыялогія» была паспяхова выканана першая ў Беларусі перасадка сэрца. У гэтым жа годзе на Беларусі правялі трансплантацыю комплексу падстраўнікавай залозы і ныркі — адну з самых рэдкіх у свеце аперацый. У студзені 2012 года прайшла першая аперацыя па перасадцы комплексу печань—нырка.

Праз дзесяць гадоў многія з названых маніпуляцый сталі звычайнай справай для айчынных медыкаў. У 2019 годзе выканана 374 трансплантацыі ныркі (у тым ліку 11 трансплантацый ныркі дзецям), 93 трансплантацыі печані (у тым ліку 12 трансплантацый печані дзецям), 52 трансплантацыі сэрца, дзевяць трансплантацый лёгкіх, 148 трансплантацый гемапаэтычных ствалавых клетак.

Дарэчы, сёння больш за палову прэпаратаў, якія выкарыстоўваюць у ахове здароўя ў нашай краіне, створана айчыннымі фармацэўтамі.

Сёлета будзе завершаны пераход арганізацый аховы здароўя, якія аказваюць першасную меддапамогу, да агульнаўрачэбнай практыкі. Гэта зробіць меддапамогу больш даступнай і якаснай.

Якасць — асноўнае слова і ў абноўленым законе «Аб ахове здароўя». Як адзначыў міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік, прадстаўляючы змены дэпутатам Палаты прадстаўнікоў у красавіку: «У законе прадугледжана стварэнне сістэмы кіравання якасцю аказання медыцынскай дапамогі. Адпаведна з ёй ствараецца вертыкаль якасці, якая непасрэдна падпарадкоўваецца Міністэрству аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, каб забяспечыць бесстароннасць і аб'ектыўнасць пры правядзенні экспертызы якасці».

Галоўныя ўрачы медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій (на іх аддзелы ўскладзена задача сачыць за якасцю дапамогі) будуць назначацца і здымацца з пасад міністрам аховы здароўя па ўзгадненні з мясцовымі ўладамі.

Як паведамляе статыстычны камітэт, чаканая працягласць жыцця беларусаў у 2019 годзе складала 69,3 года для мужчын і 79,4 для жанчын. Параўнайце гэтыя лічбы са звесткамі за 1995 год, калі працягласць жыцця складала адпаведна 62,9 года і 74,3 года. Згадзіцеся, добры паказчык эфектыўнасці медыцынскай сістэмы і яе дасягненняў!

Марыя ДАДАЛКА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Тэлесеткі

ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ ВІЦЕБСК

З 16 да 19 ліпеня праходзіць XXIX Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Белтэлерадыёкампанія традыцыйна правядзе дні культурнага форуму разам з канкурсантамі, артыстамі і гасцямі, каб паказаць усю палітру фестывальных падзей.

Тэлеканал «Беларусь 1» будзе асвятляць форум у выпусках навін і сюжэтах выніковых праграм «Панарама» і «Галоўны эфір», эксклюзіўныя інтэрв'ю будуць выходзіць у «Добрай раніцы, Беларусь!».

Выступленні ўдзельнікаў XXIX Міжнароднага конкурса выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2020» гледачы ўбачаць 19 ліпеня ў праграме «Славянскі хіт». Вечарам нас таксама чакае ўрачыстае закрыццё «Славянскага базару ў Віцебску — 2020», дзе будуць аб'яднаны другая частка дарослага конкурсу («Сусветны хіт»), выступленні прызнаных майстроў эстрады і цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і дыпламантаў форуму мастацтваў.

Праграму XVIII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2020» у прамым эфіры гледачы ўбачаць на «Беларусь 3».

КАГО ЧАКАЕ «ДЗІЦЯЧАЕ ЕЎРАБАЧАННЕ — 2020»?

Стартаваў прыём заявак на ўдзел у нацыянальным адборачным туры дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2020». Сёлета ў палажэнні аб парадку яго арганізацыі і правядзення з'явіліся істотныя змены, якія варта ўлічваць патэнцыйным канкурсантам.

Так, у сувязі з санітарна-эпідэміялагічнай сітуацыяй у свеце, рэкамендацыямі ЕВС і асаблівасцямі правядзення дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2020» у Польшчы зладзіць яго плануюць у тэлевізійнай студыі. Канчатковае рашэнне наконт удзелу Беларусі ў ім і фармату выбару прадстаўніка адкладваецца на максімальна магчымы тэрмін, але будзе агучана не пазней чым 7 верасня. Тым не менш распачаўся прыём заявак на адбор. Іх неабходна адправіць у электронным выглядзе да 15 жніўня (з суправаджальнымі дакументамі і відэазапісам жывога выканання конкурснай кампазіцыі). Фокус-група да 24 жніўня падвядзе вынікі і вызначыць 15 канкурсантаў, якія пакажуць сябе ў фінале адбору.

Фінал нацыянальнага адбору можа быць праведзены як у фармаце праслухоўвання без тэлевізійнай і інтэрнэт-трансляцыі (не пазней за 15 верасня), так і ў фармаце гала-канцэрта (да 16 кастрычніка). Калі гэта будзе праслухоўванне, то прафесійнае журы большасцю галасоў вызначыць пераможцу — афіцыйнага прадстаўніка краіны на конкурсе. Калі ж адбор правядуць у фармаце гала-канцэрта, то да 1 кастрычніка Белтэлерадыёкампанія апублікуе правілы выбару пераможцы.

Пры ўзнікненні форс-мажорных абставін і спрэчных пытанняў адносна арганізацыі міжнароднага конкурсу ў Польшчы рашэнне аб удзеле ці фармаце ўдзелу ў ім прадстаўніка Беларусі будзе прымацца Белтэлерадыёкампаніяй сумесна з ЕВС. З палажэннем правядзення нацадбору Дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2020» можна азнаёміцца на сайце медыяхолдынга ў раздзеле «Спецпраекты».

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 118

7 ліпеня 2020 года Прэзідэнцкаму спартыўнаму клубу споўнілася 15 гадоў. Як паведаміў наш чытач Уладзіслаў Сплендэр, Беларуская федэрацыя шашак арганізавала анлайн-турнір, прысвечаны гэтай падзеі. На адрас удзельнікаў спаборніцтваў паступілі прывітанні старшыні цэнтральнага савета Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Д. А. Лукашэнкі і міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь С. М. Кавальчука. У турніры ўзялі ўдзел 20 беларускіх шашыстаў, якія ў розныя гады з'яўляліся стыпендыятамі клуба. Перамог міжнародны гросмайстар Міхаіл Семянюк — 12 ачкоў з 14 магчымых. На другім месцы чэмпіён свету Ігар Міхальчанка — 11 ачкоў, трэці фінішаваў майстар Арцём Ціханаў — 10 ачкоў. У жаночым заліку найлепшай стала майстар Яна Лазовік, за ёй размясціліся чэмпіёнка свету Яна Якубовіч і міжнародны гросмайстар Вольга Федаровіч.

На дыяграме № 68 пазіцыя Аляксандра Бакумца. У кожнага з бакоў усяго па чатыры шашкі, аднак белыя знаходзяць магчымасць камбінацыйнага манеўру. Знайдзіце шлях да перамогі самастойна.

№ 68

№ 68
Белыя простыя шашкі: g1, c3, e3, g5 (4)
Чорныя простыя шашкі: h4, a5, f6, e7 (4)

Яшчэ некалькі кампазіцый прапануецца для самастойнага рашэння.

№ 69 В. Варушыла (Мінск)
Белыя простыя шашкі: 41, 44, 32, 33, 28, 30, 23, 25 (8)
Чорныя простыя шашкі: 39, 21, 19, 11, 12, 14, 9, 10 (8)

№ 70 Х. Спаньер (Нідэрланды)
Белыя простыя шашкі: 42, 43, 37, 40, 31, 35, 20 (7)
Чорныя простыя шашкі: 26, 29, 25, 18, 19, 7, 9 (7)

№ 71 В. Муляр (Украіна)
Белыя простыя шашкі: a1, g1, b2, h2, a3, c5 (6)
Чорныя простыя шашкі: d2, e3, f4, b6, a7 (5)

№ 72 М. Бойка (Украіна)
Белыя простыя шашкі: b2, h2, h4, f6, c7 (5)
Чорныя простыя шашкі: d2, e3, a5, c5, g7, h8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія першымі дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні
Выпуск № 117 ад 02.07.20.

№ 63 1. 37-31? 26:28 2. 29-23 21:34 3. 23:01 28-32 4. 40:29 32-38 5. 42:33 13-18 6. 01:23 14-20 7. 25:14 10:50

№ 64 1. c3-b4 c5:a3 2. a7:e7 d8:f6 3. a1-b2 a3:f4 4. f2-g3 h4:f2 5. e1:g7 g5-f4 6. g7-f8 f4-e3 7. f8-h6 e3-f2 8. h2-g3 f2:h4 9. h6-f4 b8-a7 10. f4-c7 +

№ 65 1. e5-d6 a3:c1 2. d6:b4 a5:c3 3. e3-d4 c3:e5 4. f4:h6 h2:f4 5. g5:e3 c1:f4 6. h6:a7+

№ 66 **Белыя простыя шашкі:** 42, 44, 38, 33, 28, 29, 30, 23, 25 (9)
Чорныя простыя шашкі: 41, 39, 31, 21, 19, 13, 14, 7, 10 (9)

1. 25-20 14:34 2. 23:05 34:43 3. 05:46 39:50 4. 42-37 50:41 5. 46:26+

№ 67 1. 48-42 37:39 2. 25-20 14:34 3. 23:05 34:23 4. 05:35+

Першымі дакладныя адказы даслалі А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск). С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск
E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

КОШТ АДПАЧЫНКУ, ЭМОЦЫЙ І ВЕДАЎ

Вандраваць, траціць (не свае) грошы і назіраць, як будуюцца ўзаемаадносіны ў чужых сем'ях, — усё гэта прапануе гледачам тэлеканал «Беларусь 2», дзе з наступнага тыдня нас чакаюць прэм'еры новых сезонаў ужо вядомых і многімі любімых праектаў.

У аўторак 21 ліпеня прыхільнікаў стылю і шопінгу чакае фэшн-шоу «Багіня шопінгу. Яскравае вяртанне». Праграма аб'ядноўвае ўсіх тых, хто пільна сочыць за модай, стылем і з задавальненнем ахвяруе на гэты занятак вольны час. Паводле ўмоў праекта, яго ўдзельніцы маюць чатыры гадзіны і пэўную суму грошай, каб набыць у краме модны ўбор. Але спачатку чацвёрка дзяўчат пакажа, што ёсць у іх уласным гардэробе. Ну а пасля прагулкі па магазінах ім трэба ацаніць здольнасць сваіх саперніц падбіраць адзенне згодна з зададзеным вобразам. У выніку тая канкурсантка, якая набярэ больш за ўсіх балаў, атрымае і матэрыяльнае ўзнагароджанне за свае старанні. Калі ўлічыць, што гэтыя дзяўчаты разбіраюцца ў модзе не горш за дызайнераў і арыентуюцца ва ўсіх навінках, дык можна зразумець: да ацэнкі яны падыходзяць не менш скрупулёзна. А яшчэ свае меркаванні выказваюць зорныя каментатары. І толькі непрадузяты погляд вядучага праграмы Леаніда Мартынчыка дапаможа разгледзець жаночую падступнасць, выявіць найлепшы вобраз і модныя тэндэнцыі.

Знакамітае трэвел-шоу «Арол і рэшка» ў пятніцу 24 ліпеня распачне «Марскі сезон». Праект, нагадаем, быў прыдуманы і ўвасоблены ў жыццё ўкраінскімі тэлевізіёншчыкамі. З моманту яго дэбюту ў 2011 годзе і па сённяшні дзень за вядучымі і іх прыгодамі па ўсім свеце назіраюць тэлегледачы розных краін. Паралельна яны знаёмяцца з мясцовым каларытам, славутасцямі і арыентуюцца ў цэнах на адпачынак. Гэтым разам новыя вядучыя шоу Мікалай Серга і Аліна Астроўская адправяцца на самыя лепшыя курорты, пляжы і ў нязведаныя куточкі, куды яшчэ не дабраліся бізнесмены і сеткавыя гатэлі. Гледачы ўбачаць неверагодныя мясціны, дзе валадараць моры і акіяны. А магчымасці кожнага з вядучых у ролі турыста вызначыць традыцыйна манетка: каму выпадае «арол», той будзе жыць ні ў чым сабе адчуць сябе багатым, а жыць аднаму ў шыкоўным асабняку можа быць, наадварот, сумна. Але незалежна ад грошай для кожнага знойдуцца цікавыя варыянты, як правесці выхадныя так, каб потым было што ўспомніць.

Яшчэ адно рэаліці-шоу чакае сустрэчы з тэлеаўдыторыяй «Абмен жонкамі-2». Праект украінскай вытворчасці з'яўляецца адаптацыяй брытанскага Wife Swap, і ў другім сезоне яго стваральнікі прапанавалі яшчэ больш знаёмстваў з рознымі сем'ямі, назіранняў за яркімі ўдзельнікамі і цікавымі сітуацыямі. Праект цяпер стаў па-сапраўднаму міжнародным: мяняцца жонкамі будуць сем'і з Украіны, Італіі, Сербіі, Іспаніі, Грэцыі і многіх іншых краін свету. Сярод гераінь сустрэнуцца самыя розныя жанчыны: мамы-мадэлі, хатнія гаспадыні, урачы, выкладчыкі, бізнес-лэдзі і беспрацоўныя. Куды яны трапяць і якія высновы зробяць для сябе пра жыццё ўдзельнікі жыццёвага эксперыменту? Глядзіце рэаліці-шоу «Абмен жонкамі-2» па суботах на «Беларусь 2».

Алена ДРАПКО.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.20 Навіны надвор'я.
10.40, 12.10 Меладрама «Адпачынак летам» (12+).
12.40, 13.05, 15.25 Меладрама «Курортны раман» (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 0.50 «Зона Х». Крымінальныя навіны (12+).
18.35 «Брэст. Героі фарпоста». Хранікальна-дакументальны фільм (6+).
19.20 Адкрыты паказ. Лёс гіганта.
21.00 Панарама.
21.50 Зразумелая палітыка.
22.00 «Славянскі базар у Віцебску». Відэадзённік.
22.10 XXIX Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». «Залаты хіт».
0.30 Арэна.
1.15 Дзень спорту.

Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 19.30 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.10 Капейка ў капейку (12+).
10.40 Камень, нажніцы, папера (16+).
11.15 «Да пабачэння» (16+).
12.00 Фэнтэзі «Оз: Вялікі і Жудасны» (12+).
14.05 «ЖаннаПажані». (16+).
15.15 М/с «Цімон і Пумба» (0+).
15.55 М/с «Пуцяводная зорка» (6+).
17.20 Баявік «Тор: Рагнарок» (12+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
21.15 «Тата папаў» (16+).
23.00 «Чалавек-невідзімка» (16+).
0.05 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Зуцы.
8.05, 12.00, 20.20 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20, 16.50 «Паездка праз горад». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.25, 18.40 «Праверка на дарогах». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.20 «Прыём па-беларуску. За кулісамі афіцыйнага візіту». Дак. фільм з цыкла «Адваротны адлік» (12+).
12.50, 21.30 «Яны сышлі з нябёсаў». Маст. фільм (12+).
14.10 «Наперад у мінулае».
14.40 «Мільён у шлюбным кошыку». Маст. фільм (12+) [СЦ].
16.15 «Доказы з мінулага». Дак. цыкл. Уладзімір Маякоўскі (16+).
18.00 «Апошні дзень». Рыгор Горын (12+).
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Прыём па-беларуску. За кулісамі афіцыйнага візіту». Дак. фільм з цыкла «Адваротны адлік» (12+).
23.00 «Душою дакрануцца да нябёсаў». Канцэрт памяці заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Анатоля Кашталапава.

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.10, 11.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 18-ы тур.
9.05 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
9.50 Спорт-мікс.
10.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Лестэр».
13.55 Фактар сілы.
14.30 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
15.00 Плаванне. Кубак і першынство Беларусі. Фінальныя заплывы.
17.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
17.40 Вялікі спорт.
18.25 Кіберспорт. Аўтаспорт. W-серыя.
19.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Шэфілд Юнайтэд» — «Эвертан». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.50 Вось гэта спорт!
22.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вулверхэмптан» — «Крыстал Пэлас». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
0.05 На грані фолу. Футбольны агляд.

АНТ

6.00, 7.05, 8.05 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
9.10 «Контуры».
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.10 Серыял «Два колеры страсці» (16+).
12.10 «Модны прыгавор» (6+).
13.10 Серыял «Зачараваны ўчастак» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20, 23.25 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Зроблена» (16+).
21.25 Серыял «Андрэеўскі сцяг» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.00 Дакументальны праект (16+).
10.40 «Джокер. Паляванне на звера». Серыял (16+).
— Глабальных праблем няма. Хіба што каранавірус, — пажартаваў ён. — А калі сур'ёзна, то ў нас цудоўны дружны калектыў. Практычна няма «цякучасці» кадраў. Усім неабходным, каб эфектыўна лячыць пацыентаў, забяспечаны. Вось нядаўна старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын уручыў ключы ад дзвюх новых машын хуткай дапамогі: адна застаецца ў Лагойску, другая будзе перададзена Аўгустоўскай амбулаторыі.

— А яшчэ мы ўдзельнічаем у праграме пасольства Японіі «Карані травы», — дадаў Васіль Аляксандравіч. — Наша бальніца разглядаецца як адзін з кандыдатаў на атрыманне гранта. На гэтыя сродкі будзе закуплена эндаскапічнае абсталяванне, у прыватнасці, фібрагастраскоп і каланаскоп, што павысіць даступнасць медыцынскай дапамогі для жыхароў раёна.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Лагойская цэнтральная раённая бальніца.

ГОМЕЛЬШЧЫНА

БУДЗЕ КАМФОРТНА!

Новая паліклініка, разлічаная на абслугоўванне 40 тысяч чалавек, у хуткім часе адкрыецца ў Гомелі

Гэта знакавы аб'ект для ўсёй сферы аховы здароўя абласнога цэнтра. Дарослае аддзяленне новай паліклінікі — другая чарга маштабнага паліклінічнага комплексу па вуліцы Мазурава, будаўніцтва якога распачалося ў Гомелі ў 2008 годзе. Першая чарга — дзіцячае аддзяленне — была ўведзена шэсць гадоў таму. Паліклініка для дарослага насельніцтва, што цяпер рыхтуецца да адкрыцця, зможа прымаць каля 800 пацыентаў у змену.

Установа аховы здароўя не толькі аблегчыць работу трох паліклінік, якія аказваюць меддапамогу жыхарам бліжэйшых мікрараёнаў, але і стане значным медыцынскім аб'ектам для ўсяго Гомеля.

На 15 тысячах квадратных метраў размясцілася ўсё неабходнае — ад вузкапрофільных аддзяленняў да дзённага стацыянара на 40 ложкаў. Тут ёсць водалячэбніца з падводным душам-масажам і басейнам, у якім могуць праводзіцца заняткі па аквагімнастыцы. Акрамя таго, будзе працаваць аддзяленне электрафізіялячэння з апаратамі магнітатэрапіі, лазератэрапіі і крыятэрапіі. Да паслуг пацыентаў — сучасныя залы ЛФК. Ёсць магчымасць практыкаваць механатэрапію.

— На працягу больш чым пяці гадоў у сферы аховы здароўя Гомеля прадумвалася пытанне і разглядаліся варыянты арганізацыі амбулаторнай рэабілітацыі пацыентаў. На базе новай паліклінікі будзе адкрыта адпаведнае аддзяленне, — растлумачыла **галоўны ўрач Гомельскай цэнтральнай гарадской паліклінікі Кацярына ЦЫТКО.**

Меддапамогу ў ім змогуць атрымліваць не толькі пацыенты, замацаваныя тэрытарыяльна за паліклінікай.

— Сёння развіццё аховы здароўя ідзе па прынцыпе арганізацыі так званых цэнтраў калектыўнага карыстання. Таму на базе новай паліклінікі плануецца развіваць шэраг агульнагарадскіх цэнтраў па пэўных кірунках. У прыватнасці, для Гомеля актуальна развіццё такога кірунку, як уралогія. Адпаведна, плануецца развіваць сучасны цэнтр уролага-андралагічнай дапамогі, — дадала галоўны ўрач.

Перспектыва развіцця цэнтра амбулаторнай рэабілітацыі — адкрыццё вузкапрофільных аддзяленняў, дзе дапамогу змогуць атрымліваць пацыенты з неўралагічнымі захворваннямі, з кардыяльнымі і траўматалагічнымі паталогіямі. Усе гэтыя кірункі плануецца ўкараняць паэтапна, а рэабілітацыйны працэс праводзіць у комплексе.

— Праграма медыцынскай рэабілітацыі будзе распрацоўвацца індывідуальна для кожнага. Асобны акцэнт — на пацыентаў з высокім рэабілітацыйным патэнцыялам. Мэта — поўнае аднаўленне працаздольнасці чалавека і прыцягненне яго да эканамічнага жыцця краіны, — падкрэсліла Кацярына Цытко.

Як унутры васьміпавярховага будынка, так і на тэрыторыі, прылеглай да новай паліклінікі, прадугледжана безбар'ернае асяроддзе: паніжаны бартавы камень каля ўваходнай групы, уладкаваны санвузлы для аслабленых людзей і пацыентаў з інваліднасцю. Прапрацаваны ўсе неабходныя аспекты камфортнага знаходжання маламабільных грамадзян ва ўстанове аховы здароўя.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ВІЦЕБШЧЫНА

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ЗДАРОЎЕ

У Прыдзвінні многае зроблена, каб узровень дыягностыкі, лячэння і рэабілітацыі быў адным з найлепшых у Еўропе. Толькі сёлета на рэканструкцыю і мадэрнізацыю бальніц, паліклінік, амбулаторый выдаткавана каля 19,5 мільёна рублёў.

Напрыклад, добрым падарункам да юбілею Вялікай Перамогі не толькі ветэранам вайны стаў адрамантаваны корпус абласнога шпіталя для інвалідаў у Юрцаве, што на Аршаншчыне. У гэтым жа раёне ў Барані завяршылі капрамонт рэабілітацыйнага бальнічнага аддзялення.

Дарэчы, у самім райцэнтры ў спальным мікрараёне Задняпроўе налета пачнуць будаваць паліклініку. Праектныя работы ўжо вядуцца, адпаведнае фінансаванне — каля 500 тысяч рублёў — выдзелена.

Паводле слоў **начальніка галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама Міхаіла ВІШНЯВЕЦКАГА**, у Оршы, а таксама ў абласным цэнтры, Полацку і Наваполацку ажыццяўляецца праект «Клапатлівая паліклініка». Адна з яго мэт — максімальная эканомія часу пацыентаў пры найбольш эфектыўным абслугоўванні.

На поўначы краіны актыўна ўкараняецца трэнд беларускай медыцыны — становіцца ўсё больш пунктаў участковай агульнаўрачэбнай практыкі. У гэтым кірунку ўжо цалкам працуюць прыгранічныя з ЕС Шаркаўшчынскі, Браслаўскі і Пастаўскі раёны. А ў Верхнядзвінску нават функцыянуе ўнікальная паліклінічная ўстанова, якая была пабудавана для «ўніверсальных» урачоў і іх памочнікаў. Яны ж становяцца ўсё больш мабільныя, каб не проста даехаць куды трэба да пацыентаў з маланаселеных і аддаленых вёсак, а рабіць гэта рэгулярна. Такім чынам здымаецца нагрузка са службы «103». «Дэсант медыкаў» паралельна можа рабіць прышчэпкі, забяспечваць лекамі, прыборамі кантролю за станам здароўя. Гэта вельмі зручна для працуючых вяскоўцаў: дзякуючы гасцям у белых халатах можна будзе, нікуды не выязджаючы, прайсці медыцынскі агляд на месцы.

Арганізавана эфектыўная дзейнасць перасоўнага медыцынскага дыягнастычнага комплексу.

У Прыдзвінскім краі каля 70 міжраённых медыцынскіх цэнтраў, аддзяленняў і кабінетаў, 13 абласных спецыялізаваных.

У правінцыі навучыліся рабіць тое, што параўнальна нядаўна магчыма было толькі ў сталіцы. Засвоена вялікая колькасць аперацый у кардыяхірургіі, нейрахірургіі, мікрахірургіі вока, якія выконваюцца на ўзроўні рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў.

У Віцебскай абласной клінічнай бальніцы функцыянуе аддзяленне планавай рэнтгенаваскулярнай дапамогі і складаных парушэнняў рытму на 25 ложкаў, з якіх шэсць — інтэнсіўнай тэрапіі. У выніку смяротнасць ад хвароб сістэмы кровазвароту на працягу апошніх пяці гадоў ніжэйшая за сярэднерэспубліканскія значэнні. Колькасць выпадкаў захворвання на востры каранарны сіндром у 2019 годзе знізілася на 16,2 %. Пасля востраго інфаркту міякарда каля 97,3 % пацыентаў дзякуючы добрай стацыянарнай рэабілітацыі могуць працаваць далей на ранейшых пасадах. Безумоўна, гэта важна для эканомікі.

Наогул, мясцовая ўлада добра разумее, што інвестыцыі ў здароўе і актыўнае даўгалецце — тое, што акупляецца з добрымі «дывідэндамі», калі так можна сказаць пра клопат аб самаадчуванні людзей.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГРОДЗЕНШЧЫНА

Аналіз прымуць у... марскім кантэйнеры

Бескантактавая модульная лабараторыя пачала дзейнічаць у Гродне

Гэта першы ў краіне вопыт забору біяматэрыялаў на COVID-19, пры якім адсутнічае непасрэдны кантакт медыцынскага работніка і пацыента. Прапускная здольнасць лабараторыі — 50 чалавек у суткі. Тут здаюць аналізы тыя, хто плануе выехаць за мяжу. Пробы робяцца на платнай аснове.

Тое, што лабараторыя месціцца ў стандартным марскім кантэйнеры, вядома, цікавы факт. Але не гэта самае важнае. Галоўная асаблівасць тут — ва ўзаемадзеянні пацыента і лабаранта. Прыём аналізаў вядзецца такім чынам, што не дапускае прамых кантактаў, бо медработнік і пацыент знаходзяцца ў дзвюх зонах, а размова вядзецца па відэасувязі.

У той зоне, якая прымае наведвальнікаў, існуе адпаведны мікраклімат, працуе сістэма вентыляцыі, адбываецца пастаянная дэзынфекцыя. У медыцынскай зоне ствараецца павышаны ціск, каб не было ніякіх скразнякоў. Дзве зоны падзяляе адмысловае шкло, у якое ўманціраваны супрацьвірусныя пальчаткі, закупленыя ў Францыі. Лабарант прасоўвае ў іх рукі і такім чынам праводзіць забор біяматэрыялу, які затым трапляе на аналіз праз дэзынфекцыйны бар'ер. У лабараторыі даследуюцца пробы на наяўнасць каранавіруса метадам ПЦР. Зрабіць аналіз змогуць тыя, хто выязджае за мяжу. Вынікі можна атрымаць на наступны дзень у фармаце міжнароднага сертыфіката. Кошт для грамадзян Беларусі — 38 рублёў, для замежнікаў — 57.

Модуль знаходзіцца каля прахадной інфекцыйнай бальніцы, і пацыентам няма неабходнасці заходзіць на тэрыторыю ўстановы. У зоне медработніка ўстаноўлена камп'ютарная тэхніка, дзякуючы якой можна бачыць неабходныя звесткі пра таго, хто прыйшоў на прыём. Запіс вядзецца толькі праз інтэрнэт на сайце Гродзенскай абласной клінічнай інфекцыйнай бальніцы. Кожнага пацыента запісваюць на вызначаны час. Такім чынам кантакты паміж тымі, хто прыходзіць на здачу мазка, атрымліваюцца мінімальныя ці наогул адсутнічаюць. Мабільная лабараторыя можа быць устаноўлена ў любым месцы.

Навінка распрацавана спецыялістамі Гродзенскай абласной інфекцыйнай бальніцы сумесна з ААТ «Тытунёвая фабрыка «Нёман». І гэта не першы вопыт супрацоўніцтва прадпрыемства і медыкаў. Па словах **галоўнага ўрача абласной інфекцыйнай бальніцы Сяргея ЦІХАНОВІЧА**, з дапамогай спонсараў абсталяваны аўтаматычны дэзбар'ер для ўрачоў, якія выходзяць з бокса. Устаноўка дазваляе значна хутчэй і дакладней апрацаваць касцюм, чым гэта робіць пульверызатар. Таксама на фабрыцы асвоілі выпуск масак і абарончых экранаў.

Лабараторыя ў марскім кантэйнеры будзе запатрабавана і надалей. Як зазначыў Сяргей Ціхановіч, забор біяматэрыялу можна весці і пры іншых інфекцыйных захворваннях, бо спіс ПЦР-даследаванняў даволі вялікі. Гэта і рэспіраторныя інфекцыі, і харчовыя — усе тыя, на якіх спецыялізуецца профільная ўстанова. Галоўнае — захаваецца прынцып бескантактавасці персаналу і пацыента.

Зараз у вобласці пяць лабараторый, якія бяруць аналізы на каранавірусную інфекцыю. Іх агульная магутнасць — 1200 даследаванняў у суткі. З красавіка, калі пачалі браць першыя пробы, зроблена больш за 80 тысяч аналізаў.

Як паведаміў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ** падчас адкрыцця лабараторыі, сітуацыя з каранавірусам у рэгіёне стабілізуецца. Гродзенская вобласць паступова выходзіць з пандэміі, таму шэраг устаноў будзе вяртацца да свайго звыклага профілю работы. Плануецца аперацыі ўзнаўляюць шэсць раёнаў вобласці. Цалкам пераходзіць на лячэнне сваіх пацыентаў гарадская бальніца № 3. Калі такая тэндэнцыя захаваецца, у ліпені колькасць устаноў, якія займаюцца лячэннем COVID-19, значна скароціцца.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота БелТА.

БРЭСТЧЫНА

КТ у Пінску і станцыя хуткай дапамогі ў Баранавічах

Не толькі ў абласным цэнтры, але і ў раёнах папаўняецца новымі аб'ектамі галіна аховы здароўя

У Брэсце адносна нядаўна ўводзілі ў строй цэлы шэраг новых аб'ектаў аховы здароўя. Найбольш яскравы прыклад — паэтапная мадэрнізацыя і рэканструкцыя аддзялення Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы, якая прырасла новымі карпусамі інфекцыйнага аддзялення. Па сутнасці, тут з'явілася новая інфекцыйная бальніца. Дадатковыя будынкі ўзведзены і ў комплексе абласной дзіцячай бальніцы, пабудаваны дзіцячая і дарослая паліклінікі. Пералік можна доўжыць.

Напярэдадні тысячагоддзя горада ўрачыста адкрылі новую станцыю хуткай дапамогі ў Зарэчным раёне Брэста. Адзначалася, што з'яўленне гэтага аб'екта наўпрост уплывае на якасць і своечасовасць аказання першай дапамогі для вялікай часткі горада, бо выезд машын з новай станцыі па вуліцы Суворава дае магчымасць зберагчы каштоўныя хвіліны, якія часта становяцца вырашальнымі. Новая станцыя ўяўляе сабой трохпавярховы адміністрацыйна-бытавы корпус з надземным гаражом-стаянкай для аўтамабіляў хуткай дапамогі. На тэрыторыі ёсць стэрылізацыйная, сістэма для абясшкоджання медыцынскіх адходаў, блок для запраўкі кіслародных балонаў, пакоі адпачынку для супрацоўнікаў, душавыя, сталоўка, канферэнц-зала.

Пераразаючы сімвалічную стужку, **старшыня аблвыканкама Анатоль ЛІС** сказаў тады аб дзяржаўным прыярытэце ў справе аховы здароўя і паабяцаў, што ў вобласці пастаянна будуць адкрывацца новыя падобныя аб'екты, сістэма аховы здароўя будзе папаўняцца абсталяваннем.

Вось і сёлета медыкі з рэгіёнаў атрымліваюць новыя магчымасці для ўдасканалення дыягнастычнага і лячэбнага працэсаў, аказання першай дапамогі. У канцы мая ў Пінскім анкалагічным дыспансеры пачаў працаваць новы камп'ютарны тамограф. Дарэчы, гэта адзін з найноўшых рэнтгенаўскіх спіральных тамографаў, якія закупіла профільнае міністэрства для ўстаноў аховы здароўя краіны.

Названы апарат быў патрэбны медыцыне ў Пінску як паветра. Папярэдні тамограф выйшаў са строю яшчэ год таму, рабіць яго рамонт было немэтазгодна — як высветлілася, кошт рамонту быў блізкі да кошту новай тэхнікі. Амаль год пацыентам анкалагічнага профілю даводзілася карыстацца паслугамі КТ Пінскай цэнтральнай бальніцы. А ў сувязі з цяперашняй эпідсітуацыяй тэрміны чакання ў чарзе сталі дасягаць чатырох месяцаў, што, зразумела, не спрыяла дакладнасці пастаноўкі дыягназу і паспяховаму лячэнню.

Паводле слоў **галоўнага ўрача Пінскага анкалагічнага дыспансера Сяргея КАХАНОВІЧА**, новы камп'ютарны тамограф мае нашмат лепшыя дыягнастычныя якасці, чым папярэдні. Гэта значыць, за меншы адрэзак часу можна атрымаць «карцінку» зоны, якая даследуецца, і, што важна, з меншай прамянёвай нагрузкай. Апарат працуе ў дзве змены, за дзень абследаванне праходзяць 32 чалавекі. Пры неабходнасці графік работы можа быць павялічаны — тады за дзень КТ пройдуць да 40 чалавек. Па накіраванні ўрача пацыенты абследуюцца бясплатна, таксама ёсць магчымасць аказання платных паслуг.

З увядзеннем у строй высокатэхналагічнай апаратуры абследаванне стала магчыма прайсці пацыентам з Пінска і Пінскага раёна, а таксам жыхарам Іванаўскага і Столінскага раёнаў. Кошт тамографа японскай вытворчасці складае 470 тысяч еўра.

А ў Баранавічах рыхтуюцца да наваселля на станцыі хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі. У зоне яе абслугоўвання (гэта горад і раён) жыве больш за 210 тысяч чалавек. Памяшканне 1948 года пабудовы не адпавядае сучасным патрэбам медыцынскай установы. Да таго ж раней станцыя была разлічана толькі на горад — пазней, калі далучылі брыгады раённых медыкаў, стала цеснавата.

Таму для станцыі ўзвялі новы двухпавярховы будынак. У ім прадугледжаны кабінеты амбулаторнага прыёму пацыентаў. Яшчэ на першым паверсе размесцяцца дыспетчарская служба, службовыя памяшканні, душавыя пакоі. Стэрылізацыйнае аддзяленне аснашчана сучаснымі сухажаравым і паравым стэрылізатарамі. Другі паверх аддалі пад адміністрацыю, пакоі адпачынку персаналу, сталоўку, канферэнц-залу.

Ідуць апошнія работы па падрыхтоўцы новай станцыі да засялення. Расстаўлены мэбля і абсталяванне. Манціруецца і праўяраецца сувязь, што вельмі важна для работы хуткай дапамогі. Паводле інфармацыі **кіраўніка станцыі Васіля БАЦКАЛЕВІЧА**, медыкі плануюць пераехаць сюды праз тыдзень-другі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Віктар ЛІСКОВІЧ:

«Людзей аб'ядноўвае жаданне працаваць і гонар за тое, што яны робяць»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці пабываў у некалькіх раёнах Гродзенскай вобласці. Падчас паездкі ён азнаёміўся з работай прадпрыемстваў і выслухаў пытанні, якія непакояць мясцовых жыхароў.

Фота grodnonews.by

Адным з адрасоў стаў Скідзель. І невыпадкова. Гэта горад-спадарожнік абласнога цэнтра, тут функцыянуе адно з самых магутных прадпрыемстваў рэгіёна — Скідзельскі цукровы камбінат. Не так даўно на заводзе змяніўся генеральны дырэктар. Па словах Віктара Лісковіча, новы кіраўнік Уладзімір Белавусаў — прафесіянал, які добра ведае галіну і можа забяспечыць стабільную работу прадпрыемства. У гэтым можна было ўпэўніцца падчас наведвання вытворчасці. Нягледзячы на сезонны характар перапрацоўкі буракоў, завод не спыняе дзейнасць, а па-ранейшаму працуе круглыя суткі — напрыклад, цяпер ідзе фасоўка прадукцыі. Значная яе частка адпраўляецца на экспарт, у асноўным у Расію, краіны Сярэдняй Азіі, на афрыканскі кантынент. За год адгружаецца 145 тысяч тон. Да новага сезона склады павінны быць пустыя, каб прымаць цукар наступнага ўраджаю. Сыравіна пачне паступаць у канцы лета.

Скідзельскі цукровы камбінат — гарадаўтваральнае прадпрыемства, дзе працуе больш за 700 чалавек. Сярэдні ўзрост крыху большы за 40 гадоў. Цяпер, па словах сенатара, важна сфарміраваць у дзяцей работнікаў станоўчы вобраз завода, каб яны потым таксама працягвалі тут працаваць, стваралі працоўныя дынастыі.

Такая тэндэнцыя відавочная. Горад-спадарожнік развіваецца, будуюцца шматпавярховікі, катэджы. Чарговым штуршком для аднаўлення стане правядзенне сёлетніх абласных «Дажынак». Галоўным аб'ектам стане Дом культуры, на рэканструкцыю якога будзе выдаткавана тры мільёны рублёў. Ён пабудаваны ў 1950-я гады, таму атрымае сучасную «начынку». Таксама ідзе добраўпарадкаванне паркавай зоны ў цэнтры горада. У тым, што вядзецца сур'ёзная падрыхтоўка да фестывалю хлебаробаў, Віктар Лісковіч упэўніўся асабіста, калі праехаў па горадзе. На яго думку, карысным новаўвядзеннем для сучаснага горада могуць стаць развіццё веларуху і пракладка веладарожак. І такая работа вядзецца. Па словах **намесніка старшыні Гродзенскага райвыканкама Валерыя БАЛАШОВА**, ёсць адпаведны праект, які раён мае намер ажыццявіць у рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва.

Прадстаўнікі працоўнага калектыву агучылі тыя праблемы, якія іх хвалююць. Па-першае, гарачае водазабеспячэнне. Ад ТЭЦ завода залежыць падача цяпла ў бліжэйшыя жылыя дамы. Але ў летні сезон ТЭЦ не функцыянуе, і гарачай вады ў дамах няма. Раённыя ўлады гатовы вырашыць пытанне, закуплены спецыяльны кацёл, які будзе працаваць на патрэбы жыхароў. Віктар Лісковіч паабяцаў узяць гэтае пытанне на кантроль. Якасці пітной вады ў краіне надаецца першаснае значэнне, і ў Скідзелі гэтую праблему неабходна вырашыць як мага хутчэй — магчыма, да канца года, падкрэсліў парламентарый.

Яшчэ адзін важны аспект, на які варта звярнуць увагу, — рака Котра. Па словах жыхароў, берагавую лінію тут трэба добраўпарадкаваць, пры магчымасці зрабіць пляжную зону. Гараджане хочуць адпачываць на сваіх вадаёмах і самі гатовы выйсці на гэтыя работы, але патрэбныя кардынацыя і план. Увогуле гэты кірунак Віктар Лісковіч лічыць важным для турыстычнай галіны. Котра — прыгожая рака, па якой адбываецца нямала сплаваў, і варта прывесці яе ў належны стан.

«Водная» тэма была працягнута на сустрэчы з калектывам агракамбіната «Князева» Зэльвенскага раёна. Тут вялікую папулярнасць сярод рыбакоў мае Зэльвенскае вадасховішча, і гэтую асаблівасць трэба выкарыстаць для перспектыўнага развіцця раёна. Як паведаміў **старшыня гаспадаркі Дзяніс АЛЬШЭЎСКІ,** работа ў такім кірунку пачалася. Разам з Гродзенскім аграрным універсітэтам рыхтуецца праект па развядзенні рэдкіх парод рыб, у прыватнасці, сцерлядзі, што дадасць папулярнасці раёну. Дарэчы, тут ёсць і свая «фішка». Гэта «Ганненскі кірмаш», вядомы ў Зэльве са старажытнасці, — 15 гадоў таму яго адрадзілі. Віктар Лісковіч лічыць, што ідэя свайго брэнда цяпер вельмі актуальная. Ён паведаміў, што ў краіне сёння вядзецца аблічбоўка ўсіх музеяў, што павысіць інфармаванасць аб спадчыне рэгіёнаў. Пра кірмаш змогуць даведацца па экспанатах музея, які месціцца ў раённым Доме культуры.

Прыкладам зладжанай работы калектыву парламентарый лічыць Ваўкавыскі мясакамбінат. Прадпрыемства — адно з найлепшых у галіне. Яго прадукцыя вядомая не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Менавіта такая праца спрыяе дабрабыту як кожнага работніка, так і ўсёй краіны.

— У выніку паездкі складваецца цэласная карціна таго, як жыве рэгіён, якія праблемы неабходна вырашаць у першую чаргу. Засяроджваецца ўвага на перспектыўным развіцці населеных пунктаў. Так, наведаўшы Скідзельскі цукровы камбінат, мы бачым, што вытворчасць працуе з захаваннем усіх тэхналагічных нарматываў. Завод наладжвае экспарт, шукае новыя рынкі збыту. Развіццё гарадаўтваральнага прадпрыемства, у сваю чаргу, спрыяе развіццю і горада-спадарожніка. Што датычыцца Зэльвенскага раёна, то тут пачынаюць удзяляць увагу турыстычнаму патэнцыялу, адраджаюць старажытныя традыцыі і святы, — зазначыў Віктар Лісковіч. — Магу сказаць, што калектыў Ваўкавыскага мясакамбіната аб'ядноўваюць жаданне працаваць і гонар за тое, што робіцца. Калі такі падыход будзе ў кожнай арганізацыі і прадпрыемстве, краіна будзе ісці наперад. А ўсім нам застанецца толькі адно — берагчы адно аднаго і рабіць агульную справу, якая будзе скіравана на стабільнасць і развіццё краіны.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Праца, турызм, адпачынак, лячэнне

Гэтыя і іншыя тэмы ўзнімаліся падчас рабочай паездкі старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея РАЧКОВА ў Пружанскі раён, што на Брэстчыне.

Сяргей Рачкоў выбраў для наведвання Ружаншчыну, якая да сярэдзіны 1950-х была асобным раёнам і цяпер складае амаль палову аднаго з найбуйнейшых раёнаў Брэстчыны. З самага пачатку Сяргей Анатолевіч сустрэўся з дэпутатамі Ружанскага сельскага Савета. Сенатар расказаў мясцовым калегам пра спецыфіку работы верхняй палаты парламента. Пасля яны абмеркавалі сітуацыю ў краіне з каранавіруснай інфекцыяй. Паводле слоў **старшыні Ружанскага сельскага Савета Аксаны ЮРКОЎСКАЙ,** мясцовыя дэпутаты загадзя рыхтаваліся гаварыць на гэтую тэму і атрыманай інфармацыяй аказаліся задаволеныя.

Затым у праграме былі традыцыйная прамая тэлефонная лінія і асабісты прыём грамадзян. Дарэчы, на прамую лінію званілі не толькі мясцовыя людзі, але і жыхары суседніх Бярозаўскага і Ваўкавыскага раёнаў. Пытанні падчас прамой лініі і прыёму найбольш датычыліся добраўпарадкавання эрытарый і жыллёвага заканадаўства. На асабісты прыём да сенатара прыйшоў 82-гадовы ветэран Узброеных Сіл Уладзімір Папоў з просьбай паспрыяць у выданні сваёй кнігі. Дарэчы, кнігу ветэран-ракетчык напісаў пра здаровы спосаб жыцця. Аўтар атрымаў падрабязную кансультацыю.

Падчас паездкі Сяргей Рачкоў наведаў сельгаспрадпрыемства «Ружаны-Агра», Ружанскі палацавы комплекс роду Сапег і санаторый «Ружанскі». У палацы госць азнаёміўся з музейнай экспазіцыяй, пацікавіўся ходам рэстаўрацыі комплексу. А ў санаторыі ўдзельнікі сустрэчы пагутарылі з персаналам і адпачывальнікамі. Дарэчы, цяпер ён запоўнены на 98 працэнтаў — гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у краіне. Пераважная большасць пацыентаў санаторыя —беларусы, расіян зараз адпачывае няшмат. Сенатар адзначыў умелую работу і сучасныя падыходы да рэкламавання сваіх паслуг. «Ружанскі» не прапускае ніводнага вялікага мерапрыемства, яго спецыялісты выступаюць там з уласнымі прэзентацыямі: нядаўна былі на фестывалі ў Александрыі, збіраюцца на «Славянскі базар», выкарыстоўваюць магчымасць прарэкламаваць сябе на тэлебачанні і ў інтэрнэце. Вынікі — у вышэйпрыведзенай лічбе.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ОКТЯБРЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

28 июля 2020 года в 10.00

проводит повторный аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь участка	Инженерная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Расходы по изготовлению документации и проведению аукциона, бел. руб.
1	д. Городище, уч. № 8, кадастровый номер 623285801101000036	0,2379 га	Электроснабжение, грунтовая дорога	2 000,00	400,00	1 700,00 (+ публикация в газете)
2	д. Дрила-2, уч. № 21А, кадастровый номер 623285802101000026	0,2490 га	Электроснабжение, асфальтированная, дорога	2 000,00	400,00	1 580,00 (+ публикация в газете)
3	д. Росохи, ул. Дачная, 13, кадастровый номер 623285805101000038	0,1806 га	Электроснабжение, грунтовая дорога, водоснабжение	2 000,00	400,00	(+ публикация в газете)
4	д. Росохи, ул. Дачная, 15, кадастровый номер 623285805101000044	0,1786 га	Электроснабжение, грунтовая дорога, водоснабжение	2 000,00	400,00	(+ публикация в газете)
5	д. Цынное, 1В, кадастровый номер 623285806601000010	0,2032 га	Электроснабжение, грунтовая дорога	2 000,00	400,00	1 439,00 (+ публикация в газете)

Аукцион проводится в здании сельисполкома по адресу: Минская область, Логойский район, аг. Октябрь, ул. Центральная, 13. Документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, **до 24 июля 2020 г. до 17.00.** Задаток перечисляется на расчетный счет BY23AKBB36006191311020000000 в ЦБУ 611 ф-ла № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНН 600181656, код платежа – 04901. Получатель – Октябрьский сельисполком. Победитель аукциона обязан в течение 10 дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок, код платежа 04901, и оплатить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, код платежа – 04616.

Телефоны для справок: (801774) 72236, 72246, 72235. Эл. адрес: **oktyabr@logoysk.gov.by.**

Условия: затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.12.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «927 управление специализированных сантехнических работ», г. Минск, ул. Железнодорожная, 37**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Адрес: г. Минск, ул. Ложинская, 16-423

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Административное помещение	70,5 кв. м	500/D-708137629

Начальная цена с НДС 20 % – 161 139,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 09.06.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов в 13.00 28.07.2020. Окончание торгов в 14.00 28.07.2020.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Принимаются по 27.07.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 431/С-35939 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина со стеклоприемным пунктом) общей площадью 100,0 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Кореличи, ул. Чехова, 5
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355100001001622, площадью 0,0354 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина) по адресу: г. п. Кореличи, ул. Чехова, 5. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, код 5.1, площадью 0,0007 га
Начальная цена продажи – 20 233,55 руб. (двадцать тысяч двести тридцать три рубля пятьдесят пять копеек) с учетом НДС
Сумма задатка – 2 023 руб. (две тысячи двадцать три рубля)
Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Кореличский филиал), 231430, г. п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28, 8-01596-2-14-84
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70
Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона
Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 17 августа 2020 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.01.2020 г.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)
Последний день приема заявлений – 13 августа 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-4486 (назначение – здание специализированное транспорта, наименование – мастерские), площадью 536,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4В
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 440100000001010536, площадью 0,4552 га (назначение – земельный участок для обслуживания мастерской), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4В
Начальная цена продажи – 175 000 руб. (сто семьдесят пять тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 17 500 руб. (семнадцать тысяч пятьсот рублей)
Продавец – транспортное унитарное предприятие «Гродненский автотранс № 9», 230003, г. Гродно, ул. Карского, 4, тел. 8-0152-74-71-54
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70
Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона
Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 19 августа 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3–209
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.04.2020 г.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18
Последний день приема заявлений – 17 августа 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «АСБ-Агро Кухтичи» (Продавец) на праве собственности

ЛОТ № 1: ЗДАНИЕ ДЕТСКОГО САДА, 623/С-58735, 355,1 кв. м. Адрес: Минская обл., Узденский р-н, Неманский с/с, д. Стальбовщина, ул. Центральная, 9. **Начальная цена с НДС** – 25 370,31 руб. Земельный участок 625682109101000061 площадью 0,5683 га. Право аренды по 21.01.2109 г.

Аукцион состоится 31.07.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by УНП 190055182

СТЫМУЛ ДЛЯ АКТЫВІСТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Змяненні адбыліся нядаўна, цяпер самы час актывістам ад народа праявіць сябе. Але пра сваіх актыўных памочнікаў дэпутаты не забывалі і раней. Тая ж Вольга Аўчыннікава згадвае, што атрымлівала ганаровыя граматы і па лініі грамадскіх арганізацый «Белая Русь» і «Беларускі саюз жанчын». Ну а званне «Чалавек года» — гэта наогул вельмі адказна і ганарова.

Жанчына кажа, што быць старастай для яе не абавязак, а стыль жыцця. Выслухаць чалавека, дапамагчы, данесці праблему да ведама мясцовай улады — гэта было для яе прыярытэтнай справай з таго самага моманту, калі ў 1983 годзе прыйшла працаваць у Пуцькі бібліятэкаркай. Абслугоўвала чытачоў з васьмі вёсак, да некаторых прыходзіла дадому. І з кожным заўсёды знаходзіла хвілінку, каб пагаманіць, распытаць пра справы.

> Вольга Аўчыннікава не разумее спажывецкіх падыходаў да справы, калі людзі патрабуюць — маўляў, вы мне павінны. Ёй лягчэй з тымі, хто заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу, каму неабыякава, што будзе з яго малой радзімай.

Пуцькі — вёска не малая: 100 двароў, каля 200 жыхароў. І стараста — сувязнае звяно паміж імі і сельсаветам. Патэлефанавалі, напрыклад, што па вуліцы праедзецца трактар, збярэ буйнагабарытнае смецце, а яна ўсіх абзваніла — рыхтуйцеся, маўляў. Пасля таго як Пуцькі далучылі да Радамльскага сельсавета, Вольга Канстанцінаўна стала асноўнай крыніцай інфармацыі. Калі трэба было пра кагосьці спытацца, тэлефанавалі непасрэдна ёй.

Сустрэча з насельніцтвам в. Пуцькі.

Аднавяскоўцы таксама прывыклі, што калі нейкія праблемы, звяртацца трэба перш за ўсё да старасты. Зімой яна і сама некаторым патэлефануе, пацікавіцца, чым дапамагчы. Ведае, што інвалідам і старым без увагі з боку не абысціся. Хоць іх яшчэ і сацработнікі апякуюць.

Бібліятэкі ў Пуцьках некалькі гадоў ужо няма, але ўсе ведаюць, што дома ў былой бібліятэкаркі шмат кніг, і ідуць да яе. Яна ж апавяшчае ўсіх, калі чакаць бібліёбус з Чавус. І не скардзіцца, што дарма патраціла на кагосьці час. Сельсавет актывістку падтрымлівае — летась, напрыклад, калі ён атрымаў прэмію за добраўпарадкаванне, старасце таксама выдзелілі капейчыну. Яна ж, лічы, свой работнік. З яе дапамогай у вёсцы стварылі кветнік, зрабілі дзіцячую пляцоўку.

— Гэтыя знакі павагі вельмі натхняюць на работу, — прызнаецца суразмоўніца. — Хоць я раблю грамадскія справы па клічы душы, без якіх-небудзь напамінаў. Цяпер вось людзі папрасілі паставіць на ўездзе ў вёску паклонны крыж — збіраем грошы, будзем рабіць. А летась жыхары здалі на дзіцячую пляцоўку каля 200 рублёў. Я неяк абмовілася, што трэба нешта зрабіць для дзяцей — школу і садок у нас закрылі, дзе ім пагуляць?

І старшыня райсавета Анатоль Мацюлін мяне падтрымаў. Дзякуючы дапамозе з райсавета ў нас цяпер ёсць дзе пагуляць дзецям у футбол ці валейбол. А яшчэ зрабілі пясочніцу, паставілі стол, лясніцтва зрабіла надзейныя лаўкі.

Вольга Аўчыннікава не разумее спажывецкіх падыходаў да справы, калі людзі патрабуюць — маўляў, вы мне павінны. Ёй лягчэй з тымі, хто заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу, каму неабыякава, што будзе з яго малой радзімай. Актывістка вельмі спачувае дэпутатам, якім трэба браць на сябе адказнасць за нядбайных людзей — займацца стыхійнымі звалкамі, спарахнелай спадчынай абыякавых нашчадкаў. Так быць не павінна, лічыць яна і робіць усё для таго, каб згуртаваць жыхароў і натхніць іх на добрыя справы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Кампетэнтна

Паліна ЦЕРАШКОВА, выканаўчы дырэктар Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў:

— У штогадовых справаздачах сярод органаў мясцовага самакіравання раней былі задзейнічаныя дзве катэгорыі — сельскія Саветы дэпутатаў і органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. У апошнюю катэгорыю ўваходзілі і калегіяльныя органы, і індывідуалы. Цяпер іх падзялілі, і гэта справядліва. У калегіяльным органе працуе група людзей, а тут усё трымаецца на актывістах. Новыя правілы будуць дзейнічаць ужо ў наступным годзе, зараз яны праходзяць юрыдычную экспертызу. Удзельнікаў у такіх спаборніцтвах заўсёды шмат, і вельмі часта некаторым не хапае аднаго-двух балаў, каб трапіць у пераможцы. Сёлета, напрыклад, даводзілася шукаць іншыя варыянты, як заахвоціць актывістаў, — уручалі падзячныя лісты ад аблсавета. Улічваючы тое, што вартых людзей шмат, мы пайшлі на гэтыя змяненні.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 16 ліпеня 2020 года.**